Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”

Н. Р. Якубук

# БЕЛАРУСКАЯ ТАПАНІМІКА І МІКРАТАПАНІМІКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс
для магістрантаў спецыяльнасці 1-21 80 11 “Мовазнаўства”

Брэст
БрДУ імя А. С. Пушкіна
2023

***ISBN 978-985-22-0670-9***

© УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», 2023

Пра выданне – 1, 2

УДК 81.161.3'373.21(075.8)
ББК 81.411.3-316

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»*

*Рэцэнзенты:*

кафедра беларускай і рускай моў УА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт"

загадчык кафедры агульнага і рускага мовазнаўства УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна" кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**В. Б. Пераход**

**Якубук, Н. Р.**

Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка [Электронны рэсурс] : электрон. вучэб.-метад. комплекс / Н. Р. Якубук ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2023. – Рэжым доступу: .

ISBN 978-985-22-22-0670-9.

У ЭВМК акрэсліваецца змест курса, падаюцца лекцыйны матэрыял, планы практычных заняткаў, якія ўключаюць пытанні для самаправеркі і тэмы рэфератаў, прапануюцца кантрольныя пытанні, тэст для самакантролю і спіс літаратуры, які дазволіць арыентавацца ў крыніцах інфармацыі па дысцыпліне.

Адрасуецца магістрантам спецыяльнасці 1-21 80 11 "Мовазнаўства" завочнай формы атрымання адукацыі.

Распрацавана ў фармаце pdf.

**УДК 81.161.3'373.21(075.8)**
**ББК 81.411.3-316**

Тэкставае вучэбнае электроннае выданне

Сістэмныя патрабаванні: тып браўзера і версія любыя; хуткасць падключэння да інфармацыйна-тэлекамунікацыйных сетак любая; дадатковыя надстройкі да браўзера не патрабуюцца.

© УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна", 2023

## 2 – вытворча-тэхнічныя звесткі

- Выкарыстанае ПЗ: Windows 10, Microsoft Office 2013;
- адказны за выпуск Ж. М. Селюжыцкая, тэхнічны рэдактар . . . , карэктар А. А. Ляснік, камп’ютарны набор і вёрстка Н. Р. Якубук;
- дата размяшчэння на сайце: 02.12.2023;
- аб’ём выдання: 1,14 Мб;
- вытворца: установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”, 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28. Тэл.: 8(0162) 21-70-55. E-mail: rio@brsu.brest.by.

# ПРАДМОВА

“Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка” – комплексная навуковая дысцыпліна, якая вывучае геаграфічныя найменні, іх паходжанне, развіццё, сучасны стан, сэнсавае значэнне, напісанне. Пытанні тапанімікі маюць вялікае навуковае і практычнае значэнне для шэрага навук, і ў першую чаргу для мовазнаўства. Тапаніміка – раздзел анамастыкі, навука аб працэсах развіцця геаграфічных назваў з часу зараджэння да нашых дзён, аб тых асноўных зменах у іх сістэме, якія праяўляюцца на розных этапах іх фарміравання.

Геаграфічныя назвы – гэта ключ да пазнання і вырашэння многіх праблем гісторыі грамадства. Тапанімія (сукупнасць геаграфічных назваў) – каштоўны ў навуковых адносінах матэрыял, які ў выніку дзейнасці чалавека даволі хутка і бясследна знікае. Таму існуе пільная неабходнасць у яго фіксацыі і апрацоўцы, чым тлумачыцца тая ўвага, якая надаецца ў лінгвістычнай і геаграфічнай літаратуры ў апошнія дзесяцігоддзі вывучэнню тапонімаў.

Курс “Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка”, які ўяўляе сабой сістэматызаваныя і абагульненыя сучасныя ўяўленні па праблемах агульнай тапанімікі і мікратапанімікі і агляд асноўных накірункаў прыкладных тапанімічных даследаванняў беларускай анамастыкі, прызваны дапамагчы магістрантам лепш зразумець асаблівасці назваў геаграфічных аб’ектаў, заканамернасці іх узнікнення, паглыбіць веды ў галіне развіцця і функцыянавання тапонімаў, прывіць любоў да роднай зямлі.

Дысцыпліна “Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка” з’яўляецца тэарэтычнай базай для фарміравання агульнафілалагічнага кругагляду магістрантаў, адным з найважнейшых складнікаў агульнамоўнай падрыхтоўкі спецыяліста. Фундаментальная тэарэтыка-метадалагічная падрыхтоўка магістрантаў-філолагаў забяспечвае іх прафесійную кампетэнцыю і сацыяльную мабільнасць.

Мэта электроннага вучэбна-метадычнага комплекса (далей – ЭВМК) – фарміраванне ў магістрантаў лінгвістычнай кампетэнцыі ў галіне тапанімікі і мікратапанімікі; забеспячэнне метадалагічнай падрыхтоўкі магістрантаў-моваэнаўцаў для паглыбленага і мэтанакіраванага авалодання найважнейшымі палажэннямі тапанімікі як навукі, яе тэрміналагічным апаратам, асноўнымі заканамернасцямі развіцця і колам тых пытанняў, якія ўваходзяць у праблемнае поле даных навуковых ведаў, неабходных для вырашэння практычных і даследчых задач.

Падчас вывучэння дысцыпліны магістранты пазнаёмяцца з асноўнымі палажэннямі, праблематыкай і паняційным апаратам беларускай тапанімікі; сфарміруюць сістэмнае і цэласнае ўяўленне пра месца тапанімікі і мікратапанімікі ў сістэме сучасных моваэнаўчых навук; атрымаюць веды пра тыпалогію назваў геаграфічных аб'ектаў, іх структуру, асаблівасці функцыянавання і распаўсюджання на тэрыторыі Беларусі; засвояць асноўныя палажэнні сучаснай тэорыі ўласнага імені; на аснове работы з рознымі крыніцамі тапанімічнай інфармацыі набудуць практычныя ўменні і навыкі для арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне анамастыкі.

ЭВМК уключае змест вучэбнага матэрыялу, тэарэтычны курс, матэрыялы да практычных заняткаў, пытанні для кантролю ведаў, тэст для самакантролю.

Тэарэтычны матэрыял выкладаецца ў адпаведнасці са зместам вучэбнай праграмы. У выніку засваення пададзенага ў выданні тэарэтычнага матэрыялу магістрант павінен

***ведаць:*** культурна-гістарычныя ўмовы фарміравання беларускай тапаніміі і мікратапаніміі; асноўныя палажэнні, праблематыку, прадмет, задачы, паняційны апарат беларускай тапанімікі і мікратапанімікі; сучасныя тэндэнцыі ў вырашэнні тэарэтычных і прыкладных праблем тапанімікі і мікратапанімікі; тыпалогію тапонімаў і асаблівасці іх распаўсюджання на тэрыторыі Беларусі; метадалогію і методыку тапанімічных даследаванняў;

***умець:***

арыентавацца ў разнастайных накірунках і канцэпцыях сучаснай анамастыкі; выяўляць тапонімы і мікратапонімы ў тэкстах, фіксаваць на месцы іх распаўсюджання, тлумачыць асаблівасці паходжання і ўтварэння; сістэматызаваць, класіфікаваць тапанімічны матэрыял з выкарыстаннем розных методык даследавання; кваліфікавана праводзіць аналіз разнастайных тапанімічных фактаў і з'яў, высвятляць іх ролю ў сучасным грамадстве; выкарыстоўваць атрыманыя веды і навыкі ў сферы прафесійнай дзейнасці, для вырашэння практычных і даследчых задач.

ЭВМК дапаможа магістрантам засвоіць тэарэтычныя палажэнні па курсе. Адказваючы на пытанні да практычных заняткаў, магістранты змогуць вяртацца да зместу лекцый. Магістрантам прапануецца работа з навуковай літаратурай, падрыхтоўка рэфератаў па актуальных тэмах.

ЭВМК распрацаваны на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 1-21 80 11-2019, вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 80 11 "Мовазнаўства", рэг. № Д-21-2-140/вуч. і рэг. № Д-21-2-141/ЗФ, зацверджаных 30.05.2019.

Вывучэнне дысцыпліны "Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка" на завочнай форме атрымання адукацыі разлічана на 90 вучэбных гадзін, з якіх 10 – аўдыторныя; размеркаванне па відах заняткаў уключае 4 лекцыйныя гадзіны (1 курс, 2 семестр) і 6 практычных гадзін (2 курс, 3 семестр); форма атэстацыі – экзамен.

**Тэма 1. Месца анамастыкі сярод іншых навук. Анамастычная лексіка ў сістэме мовы.** Анамастыка і лінгвістыка. Анамастыка і логіка. Анамастыка і гістарычныя навукі. Анамастыка і геаграфія. Анамастыка і культуралогія. Лексікалагічны, лексікаграфічны, лагічны, семасіялагічны, тэрміналагічны, тыпалагічны, псіхалагічны, сацыялагічны, геаграфічны, культуралагічны аспекты анамастычных даследаванняў.

Агульная і спецыяльная лексіка. Анамастычная лексіка – адзін з раздзелаў спецыяльнай лексікі. Апелятыў – агульнае імя: падабенства і адрозненні. Апелятыў – онім. Працэс пераходу апелятыўнай лексікі ў анімічную. Анімізацыя розных часцін мовы. Тапанімічныя апелятывы. Працэс пераходу анімічнай лексікі ў апелятыўную. Шляхі дэанімізацыі. Поўная і частковая дэанімізацыя. Перанос імя з аднаго аб'екта на іншы. Трансанімізацыя з аднаго класа назваў у іншы (ірадыяцыя). Трансанімізацыя ўнутры свайго класа назваў. Шляхі анімічных пераходаў.

**Тэма 2. Метады і прыёмы даследавання тапанімічнага матэрыялу.** Навукова-даследчы метад і яго кампаненты. Тэорыя метаду. Навукова-даследчы прыём. Метады лінгвістычных даследаванняў, якія выкарыстоўваюцца ў анамастыцы. Дэскрыптыўны (апісальны) метад. Параўнальна-гістарычны метад. Параўнальна-тыпалагічны, арэальны метад. Тэксталагічны аналіз. Стратыграфічны аналіз. Этымалагічны аналіз. Структурна-граматычны аналіз.

**Тэма 3. Тапаніміка як навука і раздзел анамастыкі.** Прадмет і задачы тапанімікі. Звесткі з гісторыі рускай і беларускай тапанімікі. Сучасны стан беларускай тапанімікі. Раздзелы тапанімікі. Крыніцы вывучэння тапаніміі. Тапанімічная сістэма. Тапанімічныя асновы. Тапанімічныя фарманты. Этымалогія народная і навуковая. Асноўныя разрады тапонімаў. Этапы фарміравання розных відаў тапонімаў. Узаемадзеянне паміж рознымі тапанімічнымі класамі.

**Тэма 4. Гідраніміка як раздзел тапанімікі.** Гідронімы – найстаражытнейшы разрад тапонімаў. Асаблівая роля водных аб'ектаў у жыцці чалавека. Рэкі і азёры як асноўныя арыенціры ў акаляючым свеце. Асноўныя прынцыпы намінацыі рэк і азёр. Семантычныя групы і структурныя тыпы гідронімаў. Патамонімы і лімнонімы як аснова фарміравання іншых відаў тапонімаў. Дэрыватыўныя сувязі гідронімаў з айконімамі і іншымі разрадамі онімаў. Гелонімы. Гідранімія і мікрагідранімія Брэсцкай вобласці: лексіка-семантычная і структурна-словаўтваральная характарыстыка.

**Тэма 5. Айканіміка як раздзел тапанімікі.** Асноўныя этапы фарміравання айканіміі. Гістарычныя змены ў прынцыпах намінацыі населеных пунктаў. Прынцыпы класіфікацыі айконімаў. Лексіка-семантычная характарыстыка айконімаўтваральных асноў. Тры асноўныя тыпы айконімаў: айконімы адапелятыўнага паходжання, адгідранімічныя і адантрапанімічныя айконімы. Разнастайныя класіфікацыі назваў населеных пунктаў. Спосабы словаўтварэння, якія выкарыстоўваюцца ў айканіміі. Прадуктыўныя і непрадуктыўныя словаўтваральныя мадэлі айконімаў. Айканімія Брэсцкай вобласці. Лексічныя рэсурсы, якія паслужылі базай для фарміравання назваў паселішчаў Брэстчыны.

**Тэма 6. Мікратапаніміка як раздзел тапанімікі.** Мікратапаніміка – навука пра назвы малых геаграфічных аб'ектаў. Мікратапонімы як асаблівы разрад тапонімаў. Асноўныя разрады мікратапонімаў. Прынцыпы намінацыі, што выкарыстоўваюцца ў мікратапаніміі. Асаблівасці словаўтварэння мікратапонімаў. Дэрыватыўныя сувязі мікратапонімаў. Мікратапонімы, утвораныя ад іншых разрадаў уласных імёнаў. Мікратапонімы як словаўтваральная база для айконімаў. Мікратапанімія Брэстчыны.

**Тэма 7. Урбананіміка і віканіміка як раздзелы тапанімікі.** Аб'ём і змест урбанонімнай прасторы. Асноўныя перыяды і працэсы ў гісторыі беларускай урбананімікі. Прынцыпы і прыкметы намінацыі ўнутрыгарадскіх аб'ектаў. Структурныя асаблівасці ўрбананіміі Беларусі. Структурна-граматычныя

тыпы ўрбанонімаў. Наменклатурныя тэрміны ва ўрбананіміі. Урбанонімы і віконімы: агульнае і адрознае. Прынцыпы намінацыі і структурныя асаблівасці ўнутрысельскіх аб'ектаў. Унутрыгарадскія – унутрысельскія назвы і светабачанне народа.

**Прыкладны тэматычны план**

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі |
| 1 | Месца анамастыкі сярод іншых навук. Анамастычная лексіка ў сістэме мовы | 2 | |
| 2 | Метады і прыёмы даследавання тапанімічнага матэрыялу | 2 | |
| 3 | Тапаніміка як навука і раздзел анамастыкі | | 2 |
| 4 | Гідраніміка як раздзел тапанімікі | | 2 |
| 5 | Айканіміка як раздзел тапанімікі | | |
| 6 | Мікратапаніміка як раздзел тапанімікі | | 2 |
| 7 | Урбананіміка і віканіміка як раздзелы тапанімікі | | |
| | **Усяго** | **4** | **6** |

# ТЭАРЭТЫЧНЫ КУРС

## Тапаніміка як навука і раздзел анамастыкі

Анамастыка – аб’ект асаблівай увагі не толькі лінгвістаў, але і гісторыкаў, этнографаў, фалькларыстаў, географаў. Тлумачыцца гэта тым, што ўласныя назвы – індывідуальныя найменні аб’ектаў з’яўляюцца найбольш старажытным лексічным пластом моўнай сістэмы і адлюстроўваюць пэўныя культурна-гістарычныя і этнаграфічныя асаблівасці жыцця народа на розных этапах яго гісторыі. Жыццё чалавека цесна звязана з мясцовасцю і яе назвамі. Разам з помнікамі старадаўняга дойлідства, руінамі гарадзішчаў і замчышчаў мы атрымалі ў спадчыну ад мінулых пакаленняў і ўласныя геаграфічныя назвы – своеасаблівы летапіс сваёй зямлі. Любая геаграфічная назва мае сваё паходжанне, гісторыю і значэнне. У кожнай назве абавязкова ёсць або быў канкрэтны гістарычны сэнс. Усімі сваімі каранямі яны звязаны з культурай народа, з’яўляюцца яе прадуктам.

Ніводнае ўласнае імя не бывае выпадковым. Імёны дае грамадства, і, як любая грамадская з’ява, яны абумоўлены гістарычна, прадыктаваны ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця сваіх творцаў. Вывучэнне гэтых імёнаў мае важнае значэнне не толькі для моваазнаўчай навукі, але і для шырокага пазнання матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Анамастыка належыць да той часткі мовы любога народа, якая адрознівае яго ад астатніх народаў, тым самым выяўляючы самабытнасць, непасрэднасць мовы канкрэтнай нацыі. У наш час, калі анамастыка вылучылася ў самастойную навуку, узрасла неабходнасць больш трывалага вывучэння асобных яе галін і раздзелаў. У сучасным моваазнаўстве ўжо выпрацаваны асноўныя прынцыпы сістэматызацыі і навуковай інтэрпрэтацыі большасці разрадаў онімнай лексікі. Аднак многія пытанні, у тым ліку даследаванне тапанімічнага матэрыялу асобных рэгіёнаў, застаюцца малавывучанымі ці зусім не вырашанымі.

Гісторыя роднага краю, далёкая і блізкая, яркая і самабытная, заўсёды прыцягвае ўвагу не толькі навукоўцаў-спецыялістаў, але і людзей з самых розных сацыяльных і прафесійных слаёў, бо гэта той падмурак, на якім народ будуе сваё сённяшняе жыццё, прагназуе будучыню. У такім рэчышчы багатыя звесткі, часта не зафіксаваныя ў пісьмовых крыніцах, пра культурную і грамадска-палітычную дзейнасць нашых продкаў змяшчаюць найменні геаграфічных аб'ектаў, якія з'яўляюцца важнай крыніцай для даследавання гісторыі і этнаграфіі любога народа.

Вывучэннем уласных геаграфічных назваў займаецца *тапаніміка* (ад грэч. *topos* 'мясцовасць' і *onyma* 'імя') – раздзел анамастыкі (навукі пра ўласныя імёны ўвогуле), які вывучае тапонімы – уласныя імёны геаграфічных аб'ектаў, іх паходжанне, гістарычныя змены, заканамернасці развіцця і функцыянавання, тэрытарыяльнае пашырэнне і спосабы славаўтварэння.

Маючы на ўвазе тапанімную спадчыну, нямецкі філолаг Вільгельм Грым пісаў: "Ёсць больш жывыя сведчанні пра народы, чым косці, дамавіны і зброя, – гэта іх мова". Сапраўды, тапонімы, у адрозненне ад археалагічных знаходак, увасабляюць у сабе моўную (гукавую) памяць пра этнасы, што значна падвышае іх інфарматыўную каштоўнасць. Адлюстроўваючы нацыянальны каларыт (г. зн. своеасаблівасць нацыянальнай мовы і культуры), тапонімы з'яўляюцца важнай часткай гістарычна-культурнай спадчыны і гэтак жа вартыя ашчаднага стаўлення і аховы, як і іншыя творы чалавечага духу і чалавечых рук. Кожны зніклы тапонім – непапраўная страта, збядненне тапанімічнага ландшафту. Скажоныя назвы не толькі ўступаюць у супярэчнасць з іх адраснай функцыяй, але і губляюць сваё нацыянальнае аблічча, моўную спецыфіку, гістарычна-культурную і навуковую вартасць.

Адрасная функцыя ўласных геаграфічных назваў надзвычай важная, але не адзіная. Тапонім – не толькі адрас, фармальны знак, але і слова, якое абазначае або некалі абазначала пэўнае паняцце. У кожнай назве абавязкова

прысутнічае або прысутнічаў канкрэтны гістарычны сэнс, усімі сваімі каранямі яны звязаны з культурай народа, з'яўляюцца яе прадуктам і параджэннем, практычна неаддзялімыя ад яе.

Два стагоддзі таму выдатны вучоны І. П. Філевіч трапна назваў тапанімію "мовай зямлі". "Мова зямлі, – пісаў ён, – значыць для нас больш, чым творы старажытных і сярэднявечных аўтараў, больш, чым сведчыць пра сваю гісторыю сам народ. . . Яна не паддаецца фальсіфікацыі. Тут нічога не прыдумаеш, нічога не перайначыш. Мінулыя эпохі, зніклыя народы і культуры даверылі «мове зямлі» берагчы памяць пра сябе. І яна свята і сумленна зберагла і пранесла яе праз вялікія перасяленні, праз вякі эвалюцый і трансфармацый, праз зрушэнні і перавароты".

## З гісторыі вывучэння беларускай тапанімікі

Нягледзячы на значныя дасягненні беларускай анамастыкі, на наяўнасць пэўнай колькасці прац па беларускай тапаніміі, яшчэ застаецца шмат нявырашаных праблем, і ў першую чаргу не сабраны, не зафіксаваны і не атрымаў належнай апрацоўкі багаты тапанімічны матэрыял. Неабходнасць у зборы, навуковай апрацоўцы, класіфікацыі, лінгвааналізе беларускай тапаніміі прадыктаваная патрэбамі часу, тымі тэарэтычнымі і прыкладнымі задачамі, што ставяцца перад сучаснай навукай. У вывучэнні, унармаванні тапонімаў зацікаўлена шырокая моўная практыка: выдавецтвы геаграфічных і геафізічных карт, атласаў, камісіі па ўпарадкаванні геаграфічных напісанняў. Да таго ж у працэсе функцыянавання мовы з апелятыўнай лексікі знікаюць асобныя словы разам са знікненнем адпаведных рэалій. Таму, вывучаючы анамастыкон пэўнага рэгіёна, становіцца магчымым рэканструяванне лексічных сродкаў мінулага часу і тым самым прадстаўленне слоўнікавага фонду беларускай мовы ў яе функцыянаванні і развіцці.

На сучасным этапе беларуская анамастычная навука прадстаўлена, хаця і нераўнамерна, даследаваннямі па ўсіх яе асноўных раздзелах. Найлепш

распрацавана айканімія Беларусі, адметныя рысы, асаблівасці развіцця якой асвятляюцца ў манаграфіях, дысертацыйных працах, шматлікіх навуковых артыкулах. Актыўны ўдзел у айканімічных даследаваннях прымаюць беларускія лінгвісты, этнографы, географы.

Беларуская тапанімія і вытворная ад яе лексіка ўсё яшчэ застаюцца маладаследаванымі. Асноўная прычына гэтага – цяжкасці, звязаныя са зборам тапанімічнага матэрыялу менавіта на месцы яго бытавання і па старажытнабеларускіх пісьмовых крыніцах. А без іх уліку нельга правесці ўнармаванне тапонімаў і вытворных ад іх.

Цікавасць да назваў геаграфічных аб’ектаў у чалавека з’явілася даўно, аднак навуковы падыход да іх вывучэння ў свеце ўзнік параўнальна нядаўна – толькі ў другой палове XVIII стагоддзя.

Багатая і разнастайная тапанімія Беларусі здаўна прыцягвала ўвагу айчынных і замежных вучоных. У гістарыяграфіі, звязанай з вывучэннем беларускай тапаніміі, вылучаецца тры асноўныя этапы: 30–40-я гады XIX стагоддзя, канец XIX – пачатак XX стагоддзя, 60-я гады XX стагоддзя – пачатак XXI стагоддзя.

Навуковы перыяд тапанімікі, як і анамастыкі ўвогуле, на Беларусі пачаўся прыкладна ў 30–40 гады XIX стагоддзя і на пачатковым этапе меў фрагментарны характар. З’явіліся першыя спробы вывучэння беларускага анамастычнага матэрыялу. Першыя спробы даследавання анамастычнай лексікі былі далёкія ад лінгвістыкі. Публікацыі на гэтую тэму ўяўлялі сабой спадарожныя нататкі, эцюды ў працах па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, у якіх рабілася спроба растлумачыць паходжанне асобных назваў населеных пунктаў ці гідрааб’ектаў. Так, напрыклад, гэта спробы растлумачыць паходжанне назвы Беларусь, паасобных назваў гарадоў Беларусі: Магілёва, Мінска, Гродна, Гомеля, Віцебска, Брэста. Па сваім змесце і метадах гэта не былі навуковыя даследаванні, і ў большасці выпадкаў яны мелі папулярызатарскае значэнне. Як правіла, мэта такіх прац – праліць святло на нейкую іншую праблему.

Аднак ужо ў канцы XIX стагоддзя (90-я гады) пачынае фарміравацца навуковы лінгвістычны падыход пры даследаванні беларускай онімнай лексікі. З'яўляюцца спецыяльныя працы, у якіх навукоўцы спрабавалі перайсці ад разгляду адзінкавых тапанімічных фактаў да вывучэння агульных заканамернасцей беларускай тапанімії.

Пачатак быў пакладзены працай А. А. Качубінскага "Территория доисторической Литвы" (1897), у якой аўтар даследуе масавы гідранімічны матэрыял (назвы рэк і азёр на тэрыторыі былой Мінскай губерні). На аснове аналізу тапонімаў аўтар устанавіў балцкае паходжанне часткі водных найменняў адзначанай тэрыторыі. І хаця дадзеныя гідранімii былі скарыстаны А. А. Качубінскім для высвятлення межаў рассялення літоўскіх плямёнаў у дагістарычную эпоху, на яго этымалогію назваў гідрааб'ектаў пазней спасылаліся многія даследчыкі. У гэтым жа годзе з'яўляецца "Этимология местных названий Витебской губернии" Ю. Ю. Трусмана. Навуковец займаецца высвятленнем паходжання, моўнай прыналежнасці гідронімаў і айконімаў. Усяго падвергнута аналізу больш за 7600 тапонімаў паўночна-ўсходняй часткі Беларусі. На жаль, многія этымалогіі аўтара аказаліся недасканалымі.

Вывучэнне беларускага анамастычнага матэрыялу на пачатку XX стагоддзя звязана з імёнамі Я. Ф. Карскага, А. І. Сабалеўскага, А. А. Шахматава, Г. А. Ільінскага. У артыкуле "Да пытання аб паходжанні назваў вёсак, мястэчак, гарадоў Беларусі" (1926) З. Я. Тараноўскі ўпершыню скарыстоўвае групавы аналіз беларускіх айконімаў, выдзяляе агульны для іх структурны тапафармант. Польскія вучоныя (М. Карась, Г. Сафарэвічава, Я. Сафарэвіч) пры вызначэнні словаўтваральных тыпаў мікратапонімаў шырока выкарыстоўвалі і тапанімію памежнай Беларусі.

Сістэматычнае і рознабаковае вывучэнне беларускага тапанімічнага матэрыялу пачалося толькі ў 60–70 гады XX стагоддзя, калі ў нашай краіне склаўся прафесійны тапанімічны калектыў.

Значна актывізаваліся тапанімічныя даследаванні ў 60-я гады, асабліва пасля першай Усебеларускай канферэнцыі па тапаніміцы СССР, якая адбылася 2 лютага 1965 года ў Ленінградзе і паслужыла стымулам для разгортвання тапанімічных даследаванняў ва ўсіх рэспубліках былога Савецкага Саюза. Беларускія даследчыкі, сярод якіх найбольш плённа працуюць у гэтыя гады Я. М. Адамовіч, Л. А. Акаловіч, М. В. Бірыла, М. Я. Грынблат, В. А. Жучкевіч, М. М. Карсакова, А. М. Катонава, В. П. Лемцюгова, А. М. Прышчэпчык, П. П. Шуба, І. Я. Яшкін, перавагу аддавалі вывучэнню айканімічнага і гідранімічнага матэрыялу.

У 70-я гады колькасць тапанімічных даследаванняў у рэспубліцы значна павялічылася. За дзесяць гадоў было апублікавана каля 100 артыкулаў, шэраг манаграфій і слоўнікаў. Як і раней, галоўнымі накірункамі тапанімічных пошукаў застаюцца айканімія, гідранімія, мікратапанімія.

У 80–90-я гады XX стагоддзя больш актыўна пачалі займацца вывучэннем тапаніміі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Мазыры. У гэтыя гады аналізу рэгіянальнай тапаніміі, у прыватнасці гідронімаў, урбанонімаў Гомеля і Палесся ў цэлым, прысвечаны асобныя публікацыі В. А. Гуліцкай, мікратапаніміі Мазырскага Палесся – артыкулы і кандыдацкая дысертацыя А. А. Івановай, мікратапаніміі Брэстчыны – публікацыі Ф. Д. Клімчука, В. М. Емельяновіч, айканіміі Беларускага Падзвіння – публікацыі Л. М. Грыгор’евай. З’яўляюцца манаграфічныя навуковыя даследаванні і навукова-папулярныя выданні. Гэта ў першую чаргу працы мовазнаўцаў А. Ф. Рогалева, Г. М. Мезенка, В. В. Шура, гісторыка Л. М. Лыча.

У 90-я гады XX стагоддзя – першае дзесяцігоддзе XXI стагоддзя абаронены доктарскія і кандыдацкія дысертацыі, прысвечаныя аналізу ўрбананіміі Беларусі (Г. М. Мезенка), этнічных і геаграфічных назваў краіны (А. Ф. Рогалеў), уласных імёнаў у мастацкім тэксце (В. В. Шур, І. М. Петрачкова, Г. М. Дзеравяга), назваў паселішчаў Гродзеншчыны (С. А. Янушкевіч), праблем узаемадзеяння гідронімаў і айконімаў Пабужжа (Н. Р. Смаль), узаемадзеяння культурнай і моўнай семантыкі ў плане зместу ўласнага імя (І. Э. Ратнікава), структурна-семантычных асаблівасцей

адтапанімных дэрыватаў на тэрыторыі Беларусі (Т. М. Шчур, З. М. Заіка, У. М. Генкін, Л. П. Кобзева) і інш.

Пэўным вынікам даследаванняў і асновай далейшага развіцця тапанімікі і анамастыкі ўвогуле стала лексікаграфічная праца з тапонімамі: павялічылася колькасць слоўнікаў, пашырылася сфера ахопу матэрыялу. Так, у 2000 годзе з'яўляецца "Анамастычны слоўнік Магілёўшчыны" (аўтары В. І. Рагаўцоў і С. Я. Кечык); у 2001 годзе "Слоўнік тапонімаў і адтапанімічных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак" (аўтар З. М. Заіка); у 2003 годзе выходзяць з друку тры слоўнікі – два па айканіміі Гомельшчыны ("Айканімія Гомельшчыны" Н. А. Багамольнікавай і А. А. Станкевіч і "Родныя назвы: Тапанімічны слоўнік Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці" А. Ф. Рогалева). 2004 год стаў годам выдання "Слоўніка мікратапонімаў Магілёўшчыны" (складальнікі С. В. Клімуць, В. І. Рагаўцоў, С. У. Шакура); 2005 год – "Слоўніка адтапанімных дэрыватаў Віцебшчыны" У. М. Генкіна, у гэтым жа годзе перавыдадзены "Слоўнік беларускіх мясцовых геаграфічных тэрмінаў: Тапаграфія. Гідралогія" І. Я. Яшкіна; 2008 год – слоўніка назваў вуліц Віцебшчыны. У 2013 годзе друкуюцца "Слоўнік назваў перайменаваных паселішчаў Беларусі" А. В. Кавалёвай і "Тапанімічны слоўнік Лагойскага раёна Мінскай вобласці (назвы населеных пунктаў)" А. Ф. Рогалева. У 2012 годзе з'яўляецца манаграфія С. У. Шахоўскай "Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця", якая ўяўляе сабой аналіз беларускіх тапанімічных і антрапанімічных слоўнікаў розных тыпаў.

Сярод галоўных прыкмет развіцця тапанімікі на пачатку XXI стагоддзя неабходна назваць: пошук новых даследчых аспектаў; асваенне "белых плям" тапанімічнай прасторы; распрацоўку агульных пытанняў тэорыі тапоніма; паглыбленае вывучэнне класічных яе раздзелаў.

Адным з новых аспектаў, які актыўна распрацоўваецца апошнім часам, з'яўляецца лінгвакультуралагічны. Мова як люстэрка народнай культуры, як крыніца гісторыі народа і яго духу даўно ўспрымалася і выкарыстоўвалася

прадстаўнікамі розных навук. Склаўшыся на мяжы XX і XXI стагоддзяў, лінгвакультуралогія якраз і мае на мэце разгляд анамастычнага, і ў тым ліку тапанімнага, матэрыялу ў аспекце ўзаемадзеяння мовы і культуры: у тапанімнай карціне свету ўвасабляецца характар культуры кожнага этнасу і кожнага чалавека. Актуальнасць такіх даследаванняў абумоўліваецца, па-першае, патрабаваннямі развіцця сучаснай тапанімікі, якая назапасіла багаты матэрыял, які мае патрэбу ва ўсебаковым вывучэнні яго з антрапацэнтрычных пазіцый; па-другое, важнасцю захоўвання культурнай спадчыны народа, якая замацавана ў назвах паселішчаў, колькасць якіх у апошнія дзесяцігоддзі скарачаецца; па-трэцяе, неабходнасцю апісання спецыфікі тапанімікону як асобнага фрагмента моўнай карціны свету; па-чацвёртае, практычнымі патрэбамі адукацыі.

Так, у серыі артыкулаў Ю. А. Гурскай 2000 года разгледжаны онім Мінск у якасці аднаго з ключавых канцэптаў беларускай мовы і культуры XX стагоддзя. У. М. Генкін апісвае айконімы віцебска-смаленскага памежжа як лінгвакультуралагічную з'яву (2009). Узаемаадносіны кодаў культуры і ўрбананіміі, своеасаблівасць айконімаў Беларусі, суадносных з катэгорыяй святасці, высвятляе ў шэрагу артыкулаў Г. М. Мезенка (2011–2013). Асаблівасці аб'ектывацыі антрапаморфнага, духоўнага, ландшафтнага, эмацыянальна-характаралагічнага, тапаморфнага, фларыстычнага кодаў у віканіміі Беларусі, кампаненты культуры адантрапанімных унутрысельскіх назваў Беларускага Паазер'я вывучаны М. Л. Дарафеенка (2014). У даследаванні Т. Ю. Васільевай структураваны ментальны вобраз месца пасялення на матэрыяле назваў населеных пунктаў Беларускага Паазер'я; вылучаны семантычныя палі айконімаў, што адлюстроўваюць асноўныя спосабы ўспрымання месца пасялення носьбітамі тапонімаў; вызначаны аб'ём семантычных палёў; комплекс кодаў культуры, рэалізацыі якіх служыць айканімія Беларускага Паазер'я (2011–2016).

Лінгвакультуралагічны аспект даследаванняў даволі цесна звязаны з этналінгвістычным, які таксама скіраваны на вывучэнне ўзаемасувязі мовы

і нацыянальнай культуры. Пры гэтым цэнтральнымі для этналінгвістыкі з'яўляюцца наступныя дзве цесна звязаныя праблемы – кагнітыўная (якім чынам, з дапамогай якіх сродкаў і ў якой форме знаходзяць адлюстраванне культурныя (бытавыя, рэлігійныя, сацыяльныя і інш.) уяўленні народа, які гаворыць на гэтай мове, аб навакольным асяроддзі і аб месцы чалавека ў гэтым свеце) і камунікатыўная (якія формы і сродкі зносін, у першую чаргу моўных зносін, з'яўляюцца спецыфічнымі для пэўнай этнічнай або сацыяльнай групы). Распрацоўка этналінгвістычнай праблематыкі ў беларускай тапаніміцы толькі пачынаецца. Адной з першых работ манаграфічнага плана стала даследаванне Т. М. Аліферчык "Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект", у якім аўтар апрацаваў больш за 1000 айконімаў і мікратапонімаў, што ў найбольшай ступені адлюстравалі асаблівасці ўспрыняцця чалавекам навакольнага асяроддзя і выявілі тыя асаблівасці і заканамернасці, якія пакладзены ў аснову старажытнага светабачання. З дапамогай семантыка-матывацыйнага аналізу і неабходнай этналінгвістычнай інтэрпрэтацыі онімаў даследчыца ўстанавіла матывавальныя асновы і рэканструявала матывацыйныя адносіны апелятываў і тапонімаў, выявіла базавыя заканамернасці семантычнай арганізацыі заходнепалескага тапанімікону, вызначыла асноўныя прынцыпы тапанімнай намінацыі, а г. зн. рэканструявала ландшафтную мадэль тапанімічнай прасторы Заходняга Палесся. Адзначаючы перспектыўнасць падобных даследаванняў, Т. М. Аліферчык перакананa, што яны дазволяць правесці супастаўляльны аналіз і вылучэнне прыярытэтных аб'ектаў у ландшафтнай тапанімічнай мадэлі прасторы розных беларускіх тэрыторый.

Калі гаварыць пра асваенне "белых плям" тапанімічнай прасторы, тых разрадаў тапонімаў, якія раней не траплялі ў поле зроку тапаністаў, то можна выдзяліць артыкулы А. І. Копача, які праводзіць даследаванне беларускіх гелонімаў. Распрацоўваецца і тэорыя віканіміі Беларусі. У прыватнасці, М. Л. Дарафеенка ў розных (намінацыйным, лінгвакультуралагічным, структурна-семантычным) аспектах прааналізавала віканімію Беларусі. Хартэнсіёнім як від

тапоніма, яго статус, тыпы і мадэлі, асаблівасці функцыянавання даследавала Г. М. Мезенка. Вывучэнню адонімных адзінак, што функцыянуюць на тэрыторыі Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцей, прысвечаны даследаванні З. М. Заікі, У. М. Генкіна, З. У. Шведавай.

Яшчэ адной важнай прыкметай развіцця тапанімікі на пачатку XXI стагоддзя з'яўляецца паглыбленае вывучэнне класічных яе раздзелаў і аспектаў. Актыўна распрацоўваўся гісторыка-этымалагічны аспект даследавання гідранімії і айканіміі (работы Р. М. Казловай і яе вучняў; Н. А. Багамольнікава, А. В. Грамыка, І. А. Гапоненка, І. Л. Капылоў, А. Ф. Рогалеў).

Пачатак XXI стагоддзя азнаменаваны паглыбленым вывучэннем рэгіянальнай праблематыкі. З усіх рэгіёнаў Беларусі найбольш распрацаванымі ў тапанімічных адносінах аказаліся Віцебскі (В. А. Барысевіч, Т. Ю. Васільева, У. М. Генкін, М. Л. Дарафеенка, Г. М. Дзеравяга, І. Я. Кураш, Г. М. Мезенка, К. А. Сасноўская, Т. І. Сінкевіч), Гомельскі (Н. А. Багамольнікава, Т. М. Багаедава, С. М. Байкова, А. А. Іванова, А. В. Кавалёва, Р. М. Казлова, З. У. Шведава), Мінскі (Ю. А. Гурская, А. І. Копач, В. П. Лемцюгова, І. Л. Капылоў, А. У. Кісліцына, Н. А. Радзіваноўская, С. У. Шахоўская) і Брэсцкі (У. У. Барысюк, Л. А. Гадуйка, В. М. Емельяновіч, З. М. Заіка, С. С. Клундук, Л. В. Леванцэвіч, В. Б. Пераход, Н. Р. Якубук), часткова Гродзенскі (В. Т. Валюк, С. А. Янушкевіч) і Магілёўскі (С. В. Клімуць, В. І. Рагаўцоў, С. У. Шакура, А. М. Шубадзёрава).

Такім чынам, стан сучаснай беларускай тапанімікі характарызуецца разнастайнасцю падыходаў да аналізу розных разрадаў тапонімаў. Найбольш актыўна ў першае дзесяцігоддзе XXI стагоддзя беларускія даследчыкі працавалі ў гісторыка-этымалагічным, лінгвакультуралагічным, этналінгвістычным, супастаўляльным і нарматыўным аспектах.

На сучасным этапе беларуская анамастычная навука прадстаўлена, хаця і не раўнамерна, даследаваннямі па ўсіх яе асноўных раздзелах. Тапанімікай назапашаны багаты матэрыял, які можна выкарыстоўваць пры вывучэнні розных дысцыплін у вышэйшых навучальных установах і школе.

## Даследаванне анамастыкону Брэстчыны

Вывучэнне асаблівасцей мовы гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся пачалося яшчэ ў XIX стагоддзі і працягваецца па сённяшні дзень. Даследаванне вядзецца па розных напрамках – ад слоўнікавых падборак да тэарэтычнага асэнсавання моўных з'яў. У асноўным гэта асобныя артыкулы па пэўных галінах мовазнаўства. Большасць артыкулаў змяшчае матэрыял па анамастыцы, лексіцы, фанетыцы. У нешматлікіх артыкулах закранаюцца пытанні дыялектнай марфалогіі, этналінгвістыкі. Апублікаваны лінгвагеаграфічныя рэгіянальныя атласы гаворак Бярозаўскага, Івацэвіцкага і Пружанскага раёнаў. У апошнім дзесяцігоддзі XX стагоддзя – на пачатку XXI стагоддзя пачалі з'яўляцца артыкулы па дыялектнай фразеалогіі. Збіранне, навуковае апісанне і публікацыя тапанімічнага матэрыялу былі і застаюцца вельмі важнымі пры даследаванні анамастыкі. Агляд прац па народнай анамастыцы Брэсцка-Пінскага Палесся праведзены на пачатку XX стагоддзя ў артыкуле "Крыніцазнаўства даследаванняў анамастыкі мовы Брэсцка-Пінскага Палесся" Л. В. Леванцэвіч.

У XIX стагоддзі зборам тапанімічнага матэрыялу на Беларусі, у тым ліку на Палессі, займаўся этнограф, географ, археолаг, фальклярыст, тапаніміст З. Даленга-Хадакоўскі (1784–1825). Ён лічыў, што неабходна дакладна пісьмова перадаваць назвы так, як іх вымаўляюць карэнныя жыхары. Прапанаваў заняцца зборам геаграфічных назваў (урочышчаў, малых і вялікіх рэк, гарадоў і паселішчаў). Ён склаў карту назваў вядомых яму гарадзішчаў і старажытных урочышчаў. Асаблівую ўвагу звяртаў на назвы населеных пунктаў, якія паходзяць ад найменняў язычніцкіх бостваў. Даказваў паходжанне і старажытную глыбіню некаторых гарадоў і рэк ад назвы язычніцкіх бостваў Лада, Лель. Адзначыў асаблівасці распаўсюджання гідронімаў і тапонімаў з назвай Дунай ("Материалы к «Сравнительному словарю географических названий славянских городищ»", 1820–1823).

У пасляваенны перыяд у сваіх працах В. А. Жучкевіч, разглядаючы пытанні тапанімії Беларусі, прыводзіць і матэрыялы з Брэстчыны.

Лексіка-семантычны склад і структура ўласных асабовых імён апелятыўнага паходжання заходняй часткі Палесся ў гістарычным плане на зрэзе XIV–XVIII стагоддзяў прааналізаваны ў манаграфіі А. К. Усціновіч “Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны” (1975). Аднак сучасны пласт антрапонімаў Палесся яшчэ не стаў аб’ектам комплекснага даследавання.

Слоўнік “Мікратапанімія Беларусі” (1974) уключае матэрыялы з Гродзеншчыны, Брэстчыны і Міншчыны. Загаловачнае слова суправаджаецца граматычнымі паметамі, указваецца значэнне мікратапоніма (лес, балота, поле).

Значнае месца ў беларускай тапаніміі займае праца Я. Н. Рапановіча “Слоўнік назваў населеных пунктаў Брэсцкай вобласці” (1982). Слоўнік ахоплівае назвы ўсіх населеных пунктаў Брэстчыны. Разглядаюцца таксама ўласныя назвы зніклых вёсак, далучаных да гарадоў, і пасёлкаў, перайменаваных, сселеных, знішчаных у гады вайны.

У 2010 годзе выйшла новая праца такога тыпу – “Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобласць”. Сярод аўтараў і выкладчыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (В. М. Емельяновіч, З. М. Заіка, Н. Р. Якубук). У выданні айконімы падаюцца на беларускай мове кірыліцай і лацінкай, а таксама на рускай мове. Беларускамоўная частка даведніка ўключае нарматыўныя найменні з націскам, граматычнымі паметамі і парадыгмамі скланення, варыянты рэестравых найменняў, а таксама зазначаны страчаныя айконімы.

Асобныя звесткі пра тапанімію Брэстчыны можна знайсці ў кнігах І. Я. Яшкіна, В. В. Шура, В. П. Лемцюговай, А. М. Мезенка, М. Л. Лыча, А. Ф. Рогалева, М. В. Бірылы і інш.

Агульны аналіз вывучэння анамастычнай лексікі Палесся робіць В. В. Шур у артыкуле “Да праблемы вывучэння анамастычнай лексікі Палесся”. Адзначаецца, што недастаткова вывучаны антрапанімічны матэрыял гаворак Палесся. У перспектыве актуальнымі могуць стаць працы, прысвечаныя ўзнікненню, паходжанню і словаўтварэнню імёнаў, прозвішчаў і мянушак жыхароў Палесся. Не

сталі аб'ектам даследавання палескія касмонімы, не даследуюцца ўласныя назвы (мянушкі) кароў, валоў, коней, сабак.

Вывучэнню анамастыкі Брэстчыны прысвечаны тры кандыдацкія дысертацыі. В. М. Емельяновіч у сваёй працы даследавала мікратапонімы ("Микротопонимия северо-западной части Брестской области"). Дысертацыя Н. Р. Смаль прысвечана тэарэтычнаму вывучэнню айконімаў і гідронімаў Брэстчыны ("Айканімія і гідранімія Пабужжа. Праблемы ўзаемадзеяння"). Айканімія і мікратапанімія беларускай часткі Заходняга Палесся паслужыла аб'ектам даследавання Т. М. Аліферчык ("Тапанімія Заходняга Палесся ў этналінгвістычным аспекце"). Тапанімічная прастора Брэсцкай вобласці і надалей засталася навуковым зацікаўленнем гэтых мовазнаўцаў.

На сённяшні дзень найбольш даследаванай з'яўляецца айканімія Брэстчыны. Айканімікон Баранавіцкага, Жабінкаўскага (разам з В. М. Андрасюк), Камянецкага, Кобрынскага, Лунінецкага, Маларыцкага, Пінскага, Столінскага (разам з С. С. Клундук) раёнаў вывучаўся і вывучаецца Н. Р. Якубук, а Пружанскага і Брэсцкага даследавала В. М. Емельяновіч. У публікацыях даецца лексіка-семантычная характарыстыка айконімаўтваральных асноў, тых лексічных рэсурсаў, якія паслужылі матывавальнай базай для фарміравання ўласных назваў паселішчаў названых раёнаў. Аўтарамі адзначаецца, што айконімы любой тэрыторыі ў абсалютнай сваёй большасці індывідуальныя і непаўторныя, што асабліва праяўляецца ў іх семантыцы, аднак у кожным з рэгіёнаў можна вылучыць наступныя лексіка-семантычныя групы: айконімы апелятыўнага паходжання, айконімы антрапанімічнага паходжання, адтапанімічныя айконімы.

Афіцыйныя назвы населеных пунктаў Кобрынскага раёна і іх мясцовыя тапанімічныя варыянты разглядаюцца ў артыкулах С. А. Сянкевіч і В. І. Сянкевіч. Лінгвакраязнаўчы змест язычніцкай (культавай) айканіміі Палесся выяўлены Л. В. Леванцэвіч. М. М. Аляхновічам і Л. В. Леванцэвіч распрацаваны тапанімічныя карты Брэстчыны: закартаграфаваны тапонімы з кампанентамі, што характарызуюць прыродна-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці і велічыню

пасяленняў, якія звязаны з язычніцкімі боствамі і якія паходзяць ад этнонімаў. В. У. Міцкевіч даследаваў айканімію Пінскага павета XVI стагоддзя. Выдадзеныя слоўнікі па айканіміі Століншчыны (аўтар З. М. Заіка) і Бярозаўшчыны (аўтар Г. М. Пыж’янава).

Мала даследаванай пакуль застаецца айканімія Ганцавіцкага, Драгічынскага, Іванаўскага, Івацэвіцкага, Ляхавіцкага раёнаў.

Першая манаграфія па тапаніміцы Брэстчыны падрыхтавана Т. М. Аліферчык (Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект. Мінск, 2013). У працы выяўлена культурна маркіраваная інфармацыя ў заходнепалескай тапаніміі; праведзена вывучэнне тапаніміі ў межах карэляцыі *мова : духоўная культура народа*, зроблена спроба высвеліць матывацыю тапонімаў і вызначыць прасторавыя параметры – лакалізацыю і канфігурацыю аб’ектаў у прасторы. У даследаванні ўпершыню аналізуюцца заходнепалескія айконімы і мікратапонімы ў этналінгвістычным асвятленні. Аўтарам праведзены аналіз айконімаў і мікратапонімаў з культурнай інфармацыяй, вызначаны іх матывацыя і матывавальная аснова, прааналізаваны віды рэпрэзентацыі семантычных апазіцый *свой-чужы* і *верх-ніз* у тапаніміі, выяўлены асаблівасці арганізацыі прасторавых адносін па вертыкалі.

Гідранімія Пабужжа вывучаецца Н. Р. Якубук у структурна-словаўтваральных і лексіка-семантычных адносінах. Выяўлена, што абсалютная большасць афіксальных айконімаў адзначанага рэгіёна ўтворана пры дапамозе суфіксаў. У адпаведнасці са значэннем утваральнай асновы вылучаецца дзве асноўныя лексіка-семантычныя групы гідронімаў – апелятыўнага і анамастычнага паходжання. Структурна-семантычную характарыстыку гідронімаў Бярозаўскага раёна падае Л. В. Леванцэвіч. Аналізуецца этымалогія азёраў і рэк рэгіёна.

Вывучэнню мікратапаніміі Брэстчыны прысвечаны артыкулы В. М. Емельяновіч і Н. Р. Якубук. Та,к В. М. Емельяновіч аналізуюцца асноўныя словаўтваральныя тыпы мікратапонімаў, структурныя тыпы мікратапонімаў-назоўнікаў, мікратапонімы ў форме прыметніка. Даследуюцца асаблівасці ўтварэння

мікратапонімаў адантрапанімічнага і адапелятыўнага паходжання (ад геаграфічных тэрмінаў і ад земляробчай лексікі); асаблівасці ўтварэння мікратапонімаў паўночна-заходняй часткі Брэстчыны ў параўнанні з мікратапаніміяй іншых тэрыторый. Н. Р. Якубук займаецца вывучэннем семантычных і структурных адметнасцей мікратапаніміі Пабужжа. Артыкулы па мікратапаніміі апублікаваны Л. В. Леванцэвіч, М. Р. Гарбачыкам, Н. І. Васілюк, З. М. Заікай, Н. І. Кацюрубай, М. А. Дарошка, Н. Міснік. Назвы ўрочышчаў асобных вёсак Брэстчыны даследавалі С. С. Клундук, Т. А. Кісель, В. Б. Пераход, Н. Р. Якубук.

Адзінкавыя артыкулы прысвечаны структурным і семантычным асаблівасцям урбананіміі Брэста (Л. А. Гадуйка, Н. П. Галімава, Н. Р. Якубук), Баранавіч (Н. Р. Якубук), Пінска (Л. А. Гадуйка, М. Фамелец). Як частку анамастычнай прасторы горада і як рэпрэзентанты кодаў культуры эргаўрбонімы г. Брэста вывучаюць Л. А. Гадуйка і В. А. Караба.

Тапанімія Брэстчыны даследавалася ў межах выканання заданняў Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гады. Фінансуемыя навукова-даследчыя працы выконваліся выкладчыкамі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна": "Ономастикон Брестчины: прагматонимия и эргонимия" (навуковы кіраўнік В. Б. Пераход), "Лінгвістычнае краязнаўства Брэстчыны: узаемадзеянне мовы і культуры" (навуковы кіраўнік Л. В. Леванцэвіч). Падчас працы над гадавым этапам "Анамастычная лексіка: нацыянальна-культурны кампанент" (2017) праводзіўся збор і аналіз мікратапонімаў, якія захоўваюць нацыянальна-культурную семантыку.

Заслугоўваюць таксама ўвагі і серыі кніг "Памяць", "Гарады і вёскі Беларусі", у якіх падаюцца энцыклапедычныя звесткі пра населеныя пункты Брэсцкай вобласці.

Як вынікае з прааналізаванага матэрыялу, больш поўна вывучана ў структурна-семантычным плане айканімія (Брэсцкі, Баранавіцкі, Кобрынскі, Лунінецкі, Пінскі, Столінскі і Пружанскі раёны) і гідранімія Брэстчыны. Даследаванне мікратапонімаў – гэта толькі або слоўнікавыя падборкі па пэўных населеных пунктах ці рэгіёнах, або асобныя артыкулы.

## Дасягненні ў вывучэнні беларускай айканіміі

Трэба адзначыць, што найлепш распрацавана айканімія Беларусі, адметныя рысы, асаблівасці развіцця якой асвятляюцца ў манаграфіях, дысертацыйных працах і шматлікіх навуковых артыкулах. Актыўны ўдзел у айканімічных даследаваннях прымаюць беларускія лінгвісты, этнографы, географы. Першым, хто звярнуўся да тапанімічнай тэматыкі, быў географ В. А. Жучкевіч. У яго кнігах (“Топонимика Белоруссии”, “Краткий топонимический словарь Белоруссии”) і артыкулах разглядаюцца як чыста айканімічныя (семантыка айконімаўтваральных асноў, геаграфія асноўных беларускіх айканімічных тыпаў), так і агульныя пытанні тапанімікі.

Пытынням, звязаным з геаграфіяй і лакалізацыяй асобных словаўтваральных тыпаў беларускіх айконімаў, прысвяціў некалькі артыкулаў В. А. Ніканаў.

Лінгвістычны накірунак у беларускай тапаніміцы прадстаўлены працамі В. П. Лемцюговай, Л. М. Грыгор’евай, М. В. Бірылы, Я. М. Адамовіча, якія аддаюць перавагу рэгіянальнаму метаду даследавання. Найхутчэй такі накірунак быў прадыктаваны практычнымі патрэбамі беларускай анамастыкі, і ў першую чаргу адсутнасцю надзейных і поўных спісаў, даведнікаў па айканіміі Беларусі. Рэгіянальны метад жа мае на мэце франтальны збор айканімічнага матэрыялу ў межах пэўных абласцей непасрэдна на месцы яго бытавання. Гэта дазваляе зафіксаваць усе назвы і іх варыянты, вызначыць правільнае вымаўленне, устанавіць лакалізацыю найменняў у адпаведнасці з сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам, даць лексіка-семантычную характырыстыку тапонімаў.

Аналіз айконімаў вядзецца пераважна ў двух аспектах – лексіка-семантычным і структурна-граматычным. Менавіта ў такім ключы даследавана айканімія Мінскай (В. П. Лемцюгова), Віцебскай (Л. М. Грыгор’ева), Гомельскай (Э. К. Бірыла) абласцей.

Так, працы В. П. Лемцюговай прысвечаны аналізу айканіміі цэнтральных раёнаў Беларусі. У манаграфіі “Беларуская айканімія” (1970) В. П. Лемцюгова ўпершыню праводзіць класіфікацыю 4000 айконімаў Мінскай вобласці. Назіранні і вывады, зробленыя на аснове аналізу назваў населеных пунктаў Міншчыны, у значнай меры адлюстроўваюць спецыфіку станаўлення і фарміравання беларускай айканіміі ўвогуле. Даследаванню рускай, беларускай і ўкраінскай айканіміі, якая паходзіць ад агульных назваў тыпаў паселішчаў, прысвечана манаграфія В. П. Лемцюговай “Восточнославянская ойконимия апеллятивного происхождения” (1983). У metricconverterProductID2008 г2008 годзе аўтар апублікавала навукова-папулярныя эцюды “Тапонімы распавядаюць”. Кніга змяшчае каля трох тысяч эцюдаў пра паходжанне назваў беларускіх паселішчаў.

Десертацыя Э. К. Бірылы “Айканімія Гомельскай вобласці” (1974) з’яўляецца манаграфічным даследаваннем айканімічнага матэрыялу Гомельскай вобласці. Аўтарам былі вызначаны асноўныя спосабы словаўтварэння айконімаў, лексіка-семантычны склад айконімаўтваральных асноў, прадуктыўнасць і лакалізацыя асноўных айканімічных тыпаў.

Л. Н. Грыгор’ева ў дысертацыі “Айканімія беларускага Падзвіння” (1978), якая таксама належыць да ліку рэгіянальных даследаванняў, у ходзе франтальнага лінгвааналізу айканімічнага ландшафту беларускага Падзвіння выявіла асаблівасці айканіміі гэтага рэгіёна ў параўнанні з астатняй тэрыторыяй Беларусі.

Некаторым агульным пытанням тапанімікі (узаемадзеянне тапанімічных і антрапанімічных асноў, шляхі тапанімізацыі словаўтваральных сродкаў) прысвечаны артыкулы В. М. Бірылы, П. П. Шубы. У працы “Літоўскія элементы ў беларускай анамастыцы” (1968) В. М. Бірыла і А. П. Ванагас вылучаюць і даследуюць літоўскія словаўтваральныя элементы ў айканіміі Беларусі. В. М. Бірыла і В. П. Лемцюгова аналізуюць дэрывацыйныя сродкі адантрапанімічнай айканіміі ўсходнеславянскіх моў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі. У сваіх даследаваннях беларускі этнограф М. Я. Грынблат выкарыстоўвае

анамастычны матэрыял у якасці дадатковай крыніцы пры вывучэнні гісторыі і этнаграфіі беларусаў.

Рост цікавасці да тапанімікі ў 70–90-я гады выражаецца ў тым, што склікаюцца канферэнцыі, сімпозіумы, выдаюцца зборнікі артыкулаў тапаністаў рэспублікі. Так, матэрыялы Першай беларускай тапанімічнай канферэнцыі апублікаваны ў зборніку "Пытанні беларускай тапанімікі" (1970), у якім асвятляюцца найважнейшыя праблемы, звязаныя з вывучэннем стану і задач тапанімікі Беларусі.

Заслугоўвае ўвагі і зборнік артыкулаў "Беларуская анамастыка", што выдаваўся Інстытутам мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. Выйшла чатыры выпускі гэтага зборніка (1977, 1981, 1985, 1993). На яго старонках змяшчаюцца артыкулы, у якіх даследуюцца ўсе асноўныя класы анамастычнай лексікі на матэрыяле розных рэгіёнаў Беларусі.

Трэці выпуск "Беларускай анамастыкі" (1985) з'явіўся вынікам творчага супрацоўніцтва калектываў Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН Беларусі, Інстытута славяназнаўства Польскай АН і мовазнаўчых кафедраў Брэсцкага ўніверсітэта (тады інстытута) па вывучэнні анамастыкі Пабужжа. Шырокае адлюстраванне ў гэтым зборніку знайшлі пытанні айканіміі і мікратапаніміі тых рэгіёнаў Брэсцкай вобласці, якія мяжуюць з Польшчай.

У 1990-х гадах яшчэ больш актыўна пачалі вывучаць тапанімікон у Мінску, Гомелі, Віцебску, Мазыры, Брэсце. З'явіліся манаграфічныя навуковыя даследаванні і навукова-папулярныя выданні. Па дадзеных М. В. Бірылы і В. П. Лемцюговай, за 1986–1991 гады па пытаннях тапанімікі апублікавана 117 артыкулаў.

У 90-я гады XX стагоддзя – першае дзесяцігоддзе XXI стагоддзя абаронена шэраг дысертацый, прысвечаных даследаванню назваў паселішчаў Гродзеншчыны (С. А. Янушкевіч), айканіміі беларускіх дзелавых помнікаў XV–XVIII стагоддзяў (І. Л. Капылоў), праблем узаемадзеяння гідронімаў і айконімаў Пабужжа (Н. Р. Смаль), структурна-семантычных асаблівасцей адтапанімных дэрыватаў

(З. М. Заіка, У. М. Генкін, З. В. Шведава, Л. П. Кобзева), айконімаў, суадносных з назвамі раслiннага свету (Н. А. Радзіваноўская), лексіка-семантычнай і структурна-граматычнай спецыфікі беларускай тапаніміі XVI стагоддзя (В. У. Міцкевіч), перайменаванняў у сістэме назваў населеных пунктаў Беларусі ў савецкі перыяд (А. В. Кавалёнак), тапаніміі Заходняга Палесся ў этналінгвістычным аспекце (Т. М. Аліферчык), айканіміі Беларускага Паазер'я ў лінгвакультуралагічным аспекце (Т. Ю. Васільева).

На пачатку XXI стагоддзя даследаванне найменняў тапанімічнага характару працягваецца. Да гэтага працэсу падключаюцца новыя аўтары, выяўляюцца новыя аспекты вывучэння.

Найбольш актыўна вывучэннем айканіміі, гідраніміі і мікратапаніміі Пабужжа займаецца Н. Р. Якубук, гідронімаў і айконімаў Гомельшчыны – Н. А. Багамольнікава. Гідранімія і мікратапанімія Магілёўшчыны сталі прадметам даследаванняў Т. М. Шаруха, І. М. Шаруха, Т. М. Шаршнёвай, Т. В. Ларковіч. Пытанні вар'іравання і нормы ў беларускай тапаніміі разглядаюцца ў публікацыях З. В. Рубцовай.

Трэба адзначыць дасягненні і ў галіне айканімічнай лексікаграфіі. Значнай падзеяй у беларускай і славянскай тапалексікаграфіі стала выданне ў 80-х гадах XX стагоддзя слоўнікаў назваў населеных пунктаў Брэсцкай, Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей Я. Н. Рапановіча. Слоўнікі ахоплівалі назвы ўсіх населеных пунктаў адзначаных абласцей. Разглядаліся таксама ўласныя назвы зніклых вёсак: далучаных да гарадоў і пасёлкаў, перайменаваных, сселеных, знішчаных у гады вайны.

У сувязі з вялікімі зменамі, што адбыліся ў тапаніміі краіны (знікненне пэўнай колькасці паселішчаў і іх назваў, вялікая колькасць перайменаванняў, састарэласць слоўнікаў назваў населеных пунктаў, выдадзеных у 1970–1980-х гадах Я. Н. Рапановічам), важнай з'явай становіцца выданне нарматыўных даведнікаў па ўсіх абласцях краіны “Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь”.

Падрыхтаваны яны калектывамі аўтараў пад кіраўніцтвам В. П. Лемцюговай, зацверджаны ў якасці нарматыўнага выдання. Пры шырокім удзеле грамадскасці Рэспублікі Беларусь – супрацоўнікаў краязнаўчых музеяў, работнікаў сельскіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў, школьных настаўнікаў, выкладчыкаў ВНУ і студэнтаў – па крупінках збіралася інфармацыя, якая легла ў аснову такіх прадстаўнічых дзяржаўных дакументаў. Гэта першы за ўсю гісторыю Беларусі поўны правапісны звод назваў населеных пунктаў абласцей са статусам нарматыўнага. Адрознівае яго ад папярэдніх слоўнікаў і даведнікаў і тое, што назвы падаюцца беларускай кірыліцай, лацінкай і рускай графікай. Паслядоўна ў беларускамоўнай частцы ва ўсіх назвах паказаны націск, род, лік, прыводзяцца парадыгмы скланення, варыянты назваў і страчаныя назвы.

У XXI стагоддзі беларуская анамастыка (і тапаніміка як яе частка) пераходзіць на новы ўзровень развіцця, фарміруецца як самастойная навука са сваім аб’ектам, метадамі і прыёмамі даследавання. Яна перасякаецца з такімі галінамі гуманітарных навук, як сацыялінгвістыка, этнаграфія, лінгвакультуралогія, кагнітыўная лінгвістыка, міфалогія, гісторыя, фальклярыстыка.

## Гідраніміка як раздзел тапанімікі

Гідраніміка таксама адносіцца да аднаго з падраздзелаў тапанімікі і вывучае гідронімы (ад грэч. *hydro* ‘вада’ і *onyma* ‘імя’), шляхі і заканамернасці іх узнікнення, матывы і тыпы намінацыі, развіццё, функцыянаванне, тэрытарыяльнае і моўнае распаўсюджванне.

Гідранімія – найбольш старажытны пласт тапанімічнай лексікі, які ўяўляе вялікую каштоўнасць не толькі для мовазнаўства, але і гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, геаграфіі, геалогіі. Тым не менш даследаванні па гідраніміі Беларусі ўсё яшчэ адстаюць ад вывучэння яе ў іншых рэгіёнах (напрыклад, ад даследаванняў у Расіі), хаця вучоныя даўно зацікавіліся гэтым пластом лексікі. Грунтоўных прац па гідраніміі Беларусі мала, у цэлым гэта паасобныя артыкулы, у якіх падаюцца фрагментарныя звесткі па асобных водных назвах. Недастаткова вывучаны таксама назвы дробных водных аб’ектаў з-за адсутнасці і сістэматызацыі гідранімічнага матэрыялу.

Упершыню назвы беларускіх рэк і азёр упамінаюцца ў старажытных летапісах (“Аповесць мінулых часоў”), у старых картаграфічных матэрыялах (“Вялікі Чарцёж”), у разнастайных дакументах, сярод якіх звяртаюць на сябе ўвагу “Матэрыялы тапаграфічных здымкаў1822–1844 гадоў”.

Масавы гідранімічны матэрыял (назвы рэк і азёр на тэрыторыі былой Мінскай губерні) даследаваўся А. А. Качубінскім у працы “Тэрыторыя дагістарычнай Літвы” (1897), у якой аўтар устанавіў балцкае паходжанне для часткі водных найменняў адзначанай тэрыторыі, на падставе чаго выказаў думку, што рака Прыпяць на поўдні з’явілася буйным прыродным рубяжом рассялення славянскіх і балцкіх плямёнаў. І хаця дадзеныя гідраніміі былі скарыстаны А. А. Качубінскім для высвятлення межаў рассялення літоўскіх плямёнаў у дагістарычную эпоху, на яго этымалогіі пазней спасылаліся многія даследчыкі. Сярод даследаванняў указанага перыяду неабходна адзначыць працы нямецкага вучонага М. Фасмера, у якіх ён звязваў беларускі гідранімічны матэрыял з гісторыка-геаграфічнымі фактарамі.

Да высвятлення моўнай прыналежнасці гідронімаў і айконімаў падключыўся Ю. Ю. Трусман. У "Этымалогіі мясцовых назваў Віцебскай губерні" (1897) ён зрабіў спробу этымалагічнага аналізу значнай колькасці (больш за 7600 адзінак) тапонімаў паўночна-ўсходняй часткі Беларусі. Аднак многія этымалогіі Ю. Ю. Трусмана аказаліся пазней ненадзейнымі.

Сістэматычнае і рознабаковае вывучэнне беларускага тапанімічнага матэрыялу пачалося толькі ў 60–70-я гады XX стагоддзя, калі ў нашай краіне склаўся прафесійны калектыў тапанімістаў.

У другой палове XX стагоддзя найбольш плённа працуюць над вывучэннем айканімічнага і гідранімічнага матэрыялу такія даследчыкі, як Я. М. Адамовіч, В. А. Жучкевіч, Л. А. Акаловіч, Э. К. Бірыла, М. Я. Грынблат, А. М. Катонава, В. П. Лемцюгова, А. М. Прышчэпчык, П. П. Шуба, І. Я. Яшкін. У 1961 годзе з'яўляецца кніга В. А. Жучкевіча "Паходжанне геаграфічных назваў Беларусі", у якой аўтар спрабуе даць аналіз семантыкі словаўтваральных асноў беларускіх гідронімаў і айконімаў. Аднак не ўсё аднолькава ўдалося аўтару ў гэтай працы: у некаторых выпадках назвы аднесены да той ці іншай групы механічна, паколькі не заўсёды ўлічвалася значэнне фармантаў.

У 1968 годзе В. А. Жучкевіч выдае кнігу "Тапаніміка Беларусі", у якой два з чатырох раздзелаў прысвечаны назвам рэк і азёраў.

Пэўныя адносіны да гідраніміі Беларусі мае манаграфія В. М. Тапарова і А. М. Трубачова "Лінгвістычны аналіз гідронімаў Верхняга Падняпроўя", у якой упершыню даецца класіфікацыя рачных найменняў па фармантах. Прапанаваная аўтарамі класіфікацыя мае на мэце сістэматызаваць гідронімы па іх словаўтваральных тыпах і мадэлях.

Больш актыўна вывучалася гідранімія Беларусі ў 70-я гады XX стагоддзя. В. А. Жучкевіч выдаў "Краткий топонимический словарь Белоруссии", у якім зрабіў спробу сістэматызаваць багаты тапанімічны (у тым ліку і гідранімічны) матэрыял Беларусі.

Неабходна адзначыць працы А. М. Катонавай. У яе кандыдацкай дысертацыі “Гідранімія басейна Заходняй Дзвіны на тэрыторыі Беларусі” (1975) аналізуецца гідранімія басейна адной з найбуйнейшых рэк Беларусі. Праца цалкам заснавана на палявым матэрыяле. У ёй даследуюцца прынцыпы намінацыі славянскіх і балтыйскіх гідронімаў адзначанага басейна, выяўляюцца іх лексічныя асновы, выводзяцца этымалогіі, шырока выкарыстоўваюцца паралелі з гідраніміі іншых славянскіх і балцкіх моў. У артыкуле “Заходнедзвінская гідранімія на тэрыторыі Беларусі” А. М. Катонава падкрэслівае блізкасць словаўтваральнай структуры заходнедзвінскай і верхнедняпроўскай гідраніміі, што пацвярджае агульнасць гістарычнага мінулага басейнаў Верхняга Дняпра і сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны.

Паасобныя пытанні беларускай гідраніміі разглядаліся ў працах рускіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх даследчыкаў (В. В. Сядова, Н. І. Талстога, В. А. Ніканава, А. П. Ванагаса, Л. Ц. Масенка і інш.).

Выклікае цікавасць кніга Р. А. Агеевай “Происхождение имен рек и озер”, у якой прасочваецца цесная залежнасць назваў рэк і азёраў ад прыродных умоў: жывёльнага і расліннага свету, наяўнасці карысных выкапняў, іх здабычы чалавекам. Р. А. Агеева змагла паказаць культурна-гістарычнае значэнне назваў рэк і азёраў, іх ролю ў гаспадарцы, звычаях, веравызнанні, сімволіцы.

Адставанне ў даследаванні гідраніміі Беларусі ў многім тлумачыцца цяжкасцямі збору гідранімічнага матэрыялу на месцы яго бытавання, адсутнасцю надзейных пісьмовых крыніц, неаднастайнасцю перадачы гідронімаў у розных спісах. Усё гэта не дае мажлівасці даследчыкам атрымаць вычарпальную інфармацыю пра назвы водных аб’ектаў.

Толькі ў 1994 годзе быў выдадзены адносна поўны энцыклапедычны даведнік “Блакітная кніга Беларусі”, дзе змешчана больш за 5,5 тыс. артыкулаў пра рэкі, азёры, ручаі, вадасховішчы, каналы (даўжынёй больш за 5 км) нашага краю, якія маюць уласную назву. Гідронімы падаюцца на беларускай мове і з указаннем месца

націску. Аднак у даведнік не трапілі звесткі пра значную колькасць невялікіх гідрааб'ектаў, якія часта захоўваюць свае старажытныя назвы і выклікаюць не меншую цікавасць, чым назвы вялікіх рэк.

У 1996 годзе з'явілася кандыдацкая дысертацыя Н. Р. Смаль "Гідранімія і айканімія Пабужжа. Праблемы ўзаемадзеяння", у якой даследчыца правяла супастаўляльны аналіз на лексіка-семантычным і структурна-словаўтваральным узроўнях гідронімаў і айконімаў Пабужжа, паказала агульнае і адрознае ў працэсе іх утварэння, характар узаемасувязі і ўзаемаўплыву паміж імі. Большая частка матэрыялу даследавання сабрана ў палявых умовах на месцы яго бытавання, а таму аналізу былі падвергнуты не толькі назвы параўнальна вялікіх гідрааб'ектаў, але і мікрагідронімы.

Дысертацыйная праца Н. А. Багамольнікавай "Гідранімія басейна ракі Прыпяць у межах Гомельшчыны" (1997) прысвечана вывучэнню гідронімаў і мікрагідронімаў басейна Прыпяці. Асаблівая ўвага нададзена ў дысертацыі аналізу вузкарэгіянальных і архаічных лексічных утварэнняў, якія адлюстроўваюць асаблівасці тагачаснага ландшафту даследуемай тэрыторыі, матэрыяльную і духоўную культуру яе насельніцтва.

У апошні час па гідраніміі Беларусі з'явіліся грунтоўныя працы Р. М. Казловай, у якіх на аснове этымалагічнага і арэальнага крытэрыяў праводзіцца рэканструкцыя праславянскага гідранімічнага фонду на матэрыяле беларускай і іншаславянскай гідраніміі. Даследчыца прыходзіць да высновы, што ў басейне верхняга і сярэдняга Дняпра, уключаючы Прыпяць, Сож, Дзясну, Нёман, Заходнюю Дзвіну, Волгу, балтыйскі субстрат не выяўляецца, як і не выяўляецца ніякі іншы. Аўтар лічыць, што хутчэй за ўсё назіраецца адваротная з'ява: славянскія гідронімы адаптаваліся іншымі этнасамі. Р. М. Казлова ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя стварыла ўласную анамастычную школу ў беларускай анамастыцы.

Сэнс асобных беларускіх гідронімаў спрабуе разгадаць А. Ф. Рогалеў у навукова-папулярных выданнях. Т. М. Багаедава свае даследаванні прысвячае рэканструкцыі старажытнай гідраніміі басейна ракі Сож.

У канцы лістапада 2002 года ў Гомелі была праведзена II Міжнародная навуковая канферэнцыя “Славянская гідранімія (анамастыка) у арэальным, этымалагічным, храналагічным, словаўтваральным і семантычным аспектах”, прысвечаная розным праблемам гідранімікі. У ёй прынялі ўдзел звыш за 50 анамастаў з Беларусі, Украіны, Расіі. Даклады гідранімістаў прысвячаліся рэканструкцыі гідранімічных старажытнасцей і адаптацыі старажытнай гідраніміі неславянскімі этнасамі, семантыцы і словаўтварэнню славянскіх гідронімаў, агульнатэарэтычным пытанням уласных назваў.

Гідронімы, як найбольш кансерватыўны пласт лексікі, з’яўляюцца ўнікальным моўным матэрыялам. Вадаёмы заўсёды адыгрывалі значную ролю ў гаспадарцы і культуры народа. У мінулым яны выкарыстоўваліся для арашэння зямлі, станавіліся цэнтрам самабытнай культуры. Назвы аб’ектаў, як правіла, адлюстроўваюць спецыфіку прыроды краю, гаспадарчую дзейнасць насельніцтва, сацыяльна-эканамічныя адносіны ў грамадстве, таму збор і даследаванне гэтага лексічнага багацця мае вялікае практычнае значэнне не толькі для мовазнаўства, але і для гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, геаграфіі.

# Мікратапаніміка як раздзел тапанімікі

**Мікратапаніміка** – раздзел тапанімікі, які вывучае *мікратапонімы* – назвы малых геаграфічных аб'ектаў: лясоў, лугоў, палёў, урочышчаў і інш. Мікратапаніміка даследуе паходжанне гэтых назваў, іх сэнсавае значэнне, развіццё, сучасны стан, вымаўленне і напісанне.

Сукупнасць мікратапонімаў на той ці іншай тэрыторыі называецца *мікратапаніміяй*. Мікратапонімы ў пэўнай ступені паўтараюць іншыя групы тапонімаў, і рэзкай мяжы, якая б аддзяляла мікратапанімію ад іншых уласных геаграфічных назваў, няма. Таму мікратапаніміка перакрыжоўваецца з шэрагам іншых раздзелаў тапанімікі: гідранімікай, айканімікай, урбананімікай, віканімікай і інш. Аднак у мікратапонімаў ёсць і шмат адметнасцяў. Так, яны бліжэй да агульных імён, чым іншыя тапонімы, нярэдкай з'явай з'яўляецца дублетнасць мікратапонімаў, іх граматычная ўстойлівасць і лексічная ўстойлівасць бываюць адноснымі. Сярод мікратапонімаў даволі значная колькасць складаных назваў, утвораных па прычыне імкнення людзей як мага болей дакладна ахарактарызаваць аб'екты, якія называюцца. Па колькасці адзінак мікратапанімія ў сотні разоў пераўвышае іншыя групы тапаніміі.

Мікратапонімы, або назвы дробных геаграфічных аб'ектаў, адносяцца да спецыфічнай часткі рэгіянальнай лексічнай сістэмы. Такія найменні маюць абмежаваную ступень вядомасці, набліжаны да апелятываў і характарызуюцца адпаведнымі семантычнымі і структурнымі асаблівасцямі. Працяглае ўжыванне часткі мікратапанімічных адзінак абумоўлівае кансервацыю ў іх складзе ўстарэлых слоў і фармантаў, фіксацыю звестак пра ранейшы стан навакольнага асяроддзя і жыццядзейнасць мясцовага насельніцтва. У іх захоўваюцца ўказанні на рассяленне і заняткі людзей у мінулым, пра былыя паселішчы, раслінны і жывёльны свет краю. Такім чынам, мэтанакіраваны збор, фіксацыя і падрабязнае вывучэнне мікратапонімаў даюць найкаштоўнейшы фактычны матэрыял для даследчыкаў рознага профілю – лінгвістаў, этнографаў, гісторыкаў, географаў, біёлагаў.

Тым не менш наяўнасць у беларускім мовазнаўстве толькі пяці буйных работ, прысвечаных назвам дробных геаграфічных аб'ектаў (дысертацыйныя даследаванні Я. М. Адамовіча, А. М. Прышчэпчык, В. М. Емельяновіч, Г. А. Івановай, В. А. Шклярыка), сведчыць пра недастатковую на сённяшні дзень распрацаванасць гэтага напрамку ў айчыннай анамастыцы. Гэта ў тым ліку пацвярджаецца ахопам тэрыторыі, мікратапанімія якой разглядаецца ў дысертацыях беларускіх вучоных. Так, Я. М. Адамовіч даследаваў лексіка-семантычныя і структурна-граматычныя асаблівасці найменняў, што ўжываюцца жыхарамі населеных пунктаў чатырох раёнаў Мінскай вобласці і аднаго раёна Брэсцкай вобласці. У работах А. М. Прышчэпчык і В. М. Емельяновіч прадстаўлены рознааспектны аналіз мікратапонімаў, сабраных у Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці і Камянецкім і Пружанскім раёнах Брэсцкай вобласці адпаведна. Дысертацыя Г. А. Івановай прысвечана ўстанаўленню паходжання і спосабаў утварэння назваў дробных геаграфічных аб'ектаў пяці раёнаў Гомельскай вобласці. Улічваючы тое, што ў межах Беларусі сёння налічваецца 118 раёнаў, пералічанымі дысертацыйнымі даследаваннямі ахоплена мікратапанімія толькі дзясятай часткі тэрыторыі краіны.

Упершыню ў беларускім мовазнаўстве комплекснаму аналізу ў лексіка-семантычным і лінгвагеаграфічным аспектах падвергнуты даволі аб'ёмны (больш за 30 тыс. найменняў) фактычны матэрыял, які, у сваю чаргу, рэпрэзентуе значную па плошчы тэрыторыю (20 раёнаў трох абласцей Беларусі) ў дысертацыі "Мікратапанімія Усходняга Палесся: лінгвагеаграфічны і лексіка-семантычны аспекты" В. А. Шклярыка (2017). У працы спецыяльнаму сістэмнаму навуковаму вывучэнню падвергнуты назвы дробных геаграфічных аб'ектаў Усходняга Палесся, вызначаецца іх роля пры вырашэнні пытання аб дыялектным чляненні рэгіёна, выяўленні і ўдакладненні семантыкі мясцовых апелятываў і тэрыторыі іх распаўсюджання ў межах усходнепалескага краю.

Існуюць пэўныя прабелы і ў справе навуковай апрацоўкі сабранага мікратапанімічнага матэрыялу: агульнай базы беларускіх назваў дробных

геаграфічных аб'ектаў на сённяшні дзень няма, хоць колькасць апублікаваных падборак такіх найменняў патрабуе пастаноўкі пытання аб іх звядзенні ў адзіны мікратапанімічны фонд Беларусі.

## Вывучэнне мікратапаніміі ў рэгіянальным аспекце

Уласныя назвы ўзнікаюць на розных этапах развіцця грамадства і нясуць у сабе адбітак сваёй эпохі. Геаграфічныя найменні даволі цесна звязаны з жыццём і дзейнасцю народа. Мы карыстаемся імі штодзённа і так прывыкаем да іх, што нават не задумваемся, што значыць тая ці іншая назва. Аднак ніводнае ўласнае імя не бывае выпадковым. Імёны дае грамадства, і, як любая грамадская з'ява, яны абумоўлены гістарычна, прадыктаваны ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця сваіх творцаў. Вывучэнне гэтых імёнаў мае важнае значэнне не толькі для мовазнаўчай навукі, але і для шырокага пазнання матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. Тапонімы не ўзнікаюць самі па сабе: іх даюць людзі, і яны служаць людзям. Назвы трывала засвойваюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Лексічны матэрыял для геаграфічных найменняў чалавек браў не выпадкова, а падбіраў з улікам пэўных заканамернасцей. Адным з адметных вынікаў гэтага складанага і працяглага гістарычнага працэсу з'яўляецца вылучэнне разнастайных лексіка-семантычных груп утваральных асноў тапаніміі Беларусі.

Вывучэнне онімаў на сучасным этапе развіцця анамастычнай навукі носіць антрапацэнтрычны характар, таму актуальным з'яўляецца даследаванне рэгіянальных падсістэм з уласцівымі ім спецыфікай і заканамернасцямі ўтварэння, функцыянавання і змянення тапанімічных адзінак. Збор, сістэматызацыя, навуковае апісанне нацыянальнай мікратапаніміі застаецца найважнейшай задачай сучаснай анамастыкі. Рэгіянальная лексіка захоўвае ў сабе шмат фактаў і звестак, што маюць прынцыпова важнае значэнне для культуры, эканомікі, сацыяльнага

жыцця, побыту. Мікратапонімы, адносячыся да спецыфічнай часткі рэгіянальнай лексічнай сістэмы, з'яўляюцца важнай крыніцай разнастайнай лінгвістычнай і экстралінгвістычнай інфармацыі, таму што кожны рэгіён – своеасаблівая тэрыторыя са сваёй гісторыяй і традыцыямі. Гэта ўнікальны моўны матэрыял, які захоўвае цікавыя звесткі пра матэрыяльную і духоўную культуру, гісторыю народа. Па мікратапонімах можна прасачыць гісторыю таго ці іншага населенага пункта, змены ў жыцці цэлых пакаленняў.

Тапанімічны ландшафт кожнага рэгіёна па-свойму ўнікальны: у залежнасці ад умоў і спосабу жыцця для кожнай мясцовасці характэрны свой індывідуальны падыход да называння геаграфічных аб'ектаў. Адным з найбольш каштоўных пластоў тапаніміі з'яўляецца мікратапанімія. Уласныя назвы невялікіх мясцовых геаграфічных аб'ектаў – жывая памяць народа. Яны захоўваюць у сабе не толькі каштоўны моўны матэрыял, але і факты гістарычнага, эканамічнага, сацыяльнага характару: дапамагаюць пранікаць у глыбокае мінулае, вывучаць гісторыю засялення пэўнай тэрыторыі, умовы жыцця, стан гаспадарання яе жыхароў, узровень развіцця навукі, культуры. Імя геаграфічнага аб'екта прадумваецца жыхарамі паселішча і служыць не толькі сродкам арыентацыі ў населеным пункце, але і адбіткам іх светапогляду і светаўспрымання.

Даследаванне мікратапаніміі важна і для вывучэння дыялектнай лексікі, яе этымалогіі і словаўтваральных тыпаў. У мікратапонімах змяшчаюцца і экстралінгвістычныя факты – указанне на раслінны і жывёльны свет краю, гісторыю яго засялення, на гаспадарчую дзейнасць нашых продкаў, таму вывучэнне мікратапонімаў дае немалаважную інфармацыю для сумежных навук. Праз асаблівасці існавання мікратапонімы – унікальны моўны матэрыял – паступова знікаюць і могуць знікнуць назаўсёды, таму неабходна сабраць, захаваць і вывучыць асноўныя працэсы фарміравання намінацыйнага комплексу ўсіх рэгіёнаў Беларусі.

Назвы ўрочышчаў, у сваёй большасці індывідуальныя і непаўторныя, як правіла, вядомы абмежаванаму колу людзей, маюць невялікі арэал распаўсюджання, таму

нельга дапусціць, каб гэтыя назвы зніклі. У кожным населеным пункце ёсць знаўцы мінуўшчыны, якія зберагаюць і перадаюць моўныя і культурныя скарбы маладому пакаленню. Наша задача – не перарваць гэтую традыцыю, збіраць тапонімы і даследаваць іх на навуковым узроўні, каб захаваць надзвычай важную катэгорыю анамастычнай лексікі.

Не зафіксаваныя на картах і ў дакументах, вядомыя толькі мясцовым жыхарам, найменні малых геаграфічных аб'ектаў – найкаштоўнейшыя помнікі, якія з'яўляюцца важнай крыніцай для даследавання гісторыі мовы, паколькі пры вывучэнні тапанімікону пэўнага рэгіёна становіцца магчымым рэканструяванне лексічных сродкаў мінулага часу. Для мясцовых жыхароў мікратапонімы служаць знакамі, пэўнымі паметамі для адрознення геаграфічных аб'ектаў. У неафіцыйных назвах закладзены мадэлі ўспрыняцця людзьмі рэчаіснасці.

Тапонімы любой тэрыторыі пры ўсёй іх разнастайнасці аказваюцца цесна звязанымі паміж сабой. Гэта тлумачыцца тым, што геаграфічныя назвы на кожнай гістарычна ці геаграфічна вылучанай тэрыторыі ўтвараюць пэўную сістэму.

Такім чынам, рэгіянальная тапаніміка на сучасным этапе з'яўляецца даволі запатрабаванай для даследаванняў галіной. Беларуская тапаніміка, як і анамастыка ў цэлым, выходзіць на лінгвакультуралагічны ўзровень вывучэння анамастычнага матэрыялу.

## Лінгвакультуралагічны падыход пры даследаванні мікратапанімii

Найбольш перспектыўныя распрацоўкі пры даследаванні тапаніміі ажыццяўляюцца ў лінгвакультуралагічным аспекце, паколькі лінгвакультуралогія, па словах А. Л. Беразовіч, вывучае пэўным чынам адабраную і арганізаваную сукупнасць культурных каштоўнасцей, даследуе жывыя камунікатыўныя працэсы спараджэння і ўспрыняцця маўлення, вопыт моўнай асобы і нацыянальны менталітэт, дае сістэмнае апісанне моўнай карціны свету.

У 1990-х гадах аформіўся новы накірунак гуманітарных даследаванняў, што знаходзяцца на стыку мовазнаўства і культуралогіі, – лінгвакультуралогія. Ён ахоплівае цэлае кола праблем, якія тычацца ўзаемадзеяння мовы і культуры.

Адным з базавых паняццяў лінгвакультуралогіі з'яўляецца паняцце культуры, у вызначэнні якога ў сучасных гуманітарных ведах вылучаецца шмат падыходаў. У межах семіятычнай канцэпцыі разглядаецца ідэя разумення культуры як іерархічна арганізаванай сістэмы базавых кодаў, асновай якіх з'яўляюцца разнастайныя фрагменты акаляючай рэчаіснасці. Код – гэта паняцце, якое першапачаткова выкарыстоўвалася ў семіётыцы для раскрыцця сэнсу паведамлення.

Гэтыя дэфініцыі кодаў культуры дапаўняюць адна адну, аднак некаторыя разыходжанні ў вызначэнні данага паняцця абумоўліваюць існаванне розных падыходаў да вылучэння базавых кодаў традыцыйнай культуры. Даследчыкі вылучаюць ад чатырох да пятнаццаці кодаў культуры. Аналізуючы ўнутрыгарадскія назвы, Г. М. Мезенка вылучае восем кодаў культуры: тапаморфны, антрапаморфны, фізіка-геаграфічны, фларыстычны (ці батанічны), фаўністычны, эмацыйна-характаралагічны, колеравы і тэмпаральны.

Сучаснай навукай прызнаецца той факт, што культурнай значнасцю валодаюць усе адзінкі мовы, асабліва анамастычная лексіка, якая ўтрымлівае значны гісторыка-культурны патэнцыял, а таму з'яўляецца каштоўнай крыніцай інфармацыі пра спецыфічныя рысы карціны свету, што ўласцівы пэўнаму этнасу.

Разгляд назваў аб'ектаў у лінгвакультуралагічным аспекце мае на мэце вывучэнне іх лінгвістычнага і культуралагічнага складнікаў. Для даследавання і разумення найменняў на гэтым узроўні неабходна валодаць базай фонавых ведаў, важных для інтэрпрэтацыі імя ўласнага. Тлумачэнне назвы можа патрабаваць увагі да этымалагічнага аналізу слова ў тым выпадку, калі сувязь формы са значэннем незразумелая носьбітам мовы. Разглядаючы найменне як складнік мовы культуры, неабходна ўлічваць нацыянальную ментальнасць і культурна-гістарычныя традыцыі, якія абумовілі з'яўленне імя ўласнага.

Сфарміраваўшыся як асобны раздзел анамастыкі, мікратапаніміка не губляе сваёй актуальнасці, аднак на сучасным этапе развіцця даследаванняў мовы ў напрамку антрапацэнтрызму ўзнікае неабходнасць у новым асэнсаванні мікратапанімічнага матэрыялу. Пэўная трансфармацыя ідэй звязана з неабходнасцю аналізаваць найменні ўрочышчаў не толькі з пазіцый сістэмна-структурнай лінгвістыкі, але і ў аспекце культуры носьбітаў той ці іншай мовы.

Анамастычная лексіка была і застаецца аб'ектам пільнай увагі даследчыкаў: менавіта яна валодае велізарным культуразнаўчым патэнцыялам. А тое, што зварот да назваў дробных аб'ектаў можа дапамагчы актуалізаваць інфармацыю пра духоўную культуру насельнікаў вёсак, не патрабуе асобных доказаў.

На пачатак XXI стагоддзя прыпадае найбольшая колькасць дысертацыйных даследаванняў, выкананых у лінгвакультуралагічным ключы. Аб'ектам вывучэння становяцца розныя разрады онімаў. Адным з асноўных паняццяў лінгвакультуралогіі, як і многіх іншых гуманітарных навук, з'яўляецца карціна свету.

Базавымі складнікамі вербальнай карціны свету з'яўляюцца геаграфічны, гістарычны і культурны, якія ўзаемаабумоўлены, узаемазвязаны і ўзаемадапаўняюць адзін аднаго: усе мясцовыя аб'екты маюць сваю лакалізацыю ў прасторы і выконваюць адрасную функцыю; усе назвы ў шырокім разуменні гістарычныя, таму што валодаюць сваёй унікальнай гісторыяй, фарміраваліся ў розныя перыяды развіцця этнасу, утрымліваюць інфармацыю пра асноўныя гістарычныя і сацыяльныя падзеі; усе мікратапонімы валодаюць велізарным культуразнаўчым патэнцыялам, кадзіруюць інфармацыю пра ўспрыманне чалавекам акаляючага яго свету. Такім чынам, мікратапонімы як этнакультурныя, лінгвістычныя, культуралагічныя і кагнітыўныя знакі служаць для намінацыі геаграфічных аб'ектаў, а мадэляванне вербальнай карціны свету – адзін з сістэмаўтваральных спосабаў вербалізацыі рэчаіснасці, якія адлюстроўваюць карэляцыю гісторыка-культурных, этнакультурных, сацыяльных, моўных аспектаў развіцця народа.

У анамастыцы адной з найбольш распрацаваных карцін свету з’яўляецца тапанімічная. Мікратапаніміка мае цесную сувязь з навакольнай рэчаіснасцю і чалавекам, яго свядомасцю, духоўна-практычнай дзейнасцю. Згодна з Л. М. Дзмітрыевай, тапанімічная карціна свету маніфестуе існаванне на пэўнай тэрыторыі пэўнай сукупнасці геаграфічных назваў, якія сфарміраваліся ў рэгіянальным моўным асяроддзі і адлюстроўваюць асаблівасці мовы, моўнай рэгіянальнай сістэм.

Найменні геаграфічных аб’ектаў, або тапонімы, як частка моўнай прасторы, фарміруюць асаблівы фрагмент моўнай карціны свету, у якой спецыфічным чынам адбіваюцца светабачанне і светаразуменне народа, яго гісторыя і культура. Для разумення моўнай прасторы неабходна паглыбленне і шматбаковае веданне спецыфікі ўсіх яе элементаў. Таму цалкам відавочна, што неабходнасць даследавання рэгіянальнага матэрыялу, у тым ліку анамастычнага, працягвае заставацца актуальнай задачай лінгвістыкі, у прыватнасці тапанімікі.

Тапонімы, з’яўляючыся словамі натуральнай мовы, выступаючы ўніверсальнай мовай культуры, у большасці выпадкаў адсылаюць да канкрэтных культурных рэалій, якія ў сваю чаргу ўтвараюць спецыфічныя “мовы” культуры – коды. У гэтым аспекце мікратапонімы канкрэтнага населенага пункта ўяўляюць сабой спосаб моўнага ўвасаблення разнастайных кодаў культуры, выступаюць захавальнікамі і эксплікатарамі культурнага зместу, выяўленне якога дазваляе аднавіць цэласную карціну ментальнай сферы носьбітаў тапонімаў і вызначыць спецыфіку мікратапоніма як фрагмента моўнай карціны свету.

# Урбананіміка як раздзел тапанімікі

*Урбананімія* – сукупнасць урбанонімаў, г. з. назваў унутрыгарадскіх аб'ектаў (лац. *urbanus* 'гарадскі'). Да ўрбанонімаў належаць назвы вуліц, плошчаў, завулкаў, кварталаў, асобных дамоў, крамаў, кафэ, рэстаранаў і г. д. У розныя перыяды асобныя аб'екты адыгрывалі неаднолькавую ролю. Зараз вуліцы ўяўляюцца асноўным структурным фактарам горада. Да XVII стагоддзя яны вылучаліся вельмі невыразна. У сучаснай тапаніміцы ўрбанонімы прадстаўлены ў якасці састаўных элементаў пастаянна зменлівай сістэмы. Яны адлюстроўваюць культурныя ўяўленні грамадства, якое выкарыстоўвае іх.

Уласныя імёны вуліц, завулкаў, плошчаў і іншых унутрыгарадскіх аб'ектаў, якія фарміруюцца пад уздзеяннем розных фактараў (гістарычных, геаграфічных, этнаграфічных, сацыяльных, лінгвістычных), з'яўляюцца багатай крыніцай для вывучэння культуры і гісторыі беларусаў, беларускай і іншых моў.

*Урбананіміка* – раздзел анамастыкі, які займаецца вывучэннем назваў унутрыгарадскіх аб'ектаў, заканамернасцей іх узнікнення, развіцця і функцыянавання.

Варта адзначыць, што пачынаючы з 80-х гадоў XX стагоддзя назіраецца ўзмацненне цікавасці да ўрбананімных адзінак, у прыватнасці да праблемы намінацыі ўнутрыгарадскіх і ўнутрывясковых аб'ектаў. Аднак, перш чым разглядаць урбананімію ў сучасным выглядзе, звернемся да гісторыі яе развіцця.

Урбананімная гісторыя Беларусі пачынаецца з XI–XII стагоддзяў. Першыя ж пісьмовыя згадкі пра ўнутрыгарадскія назвы, і ў прыватнасці пра назвы вуліц, належаць да XV–XVI стагоддзяў.

Вядомы анамаст Г. М. Мезенка прапануе падзяліць тысячагадовую гісторыю беларускай урбананіміі на два асноўныя перыяды: перыяд данацыянальнага развіцця беларускіх унутрыгарадскіх найменняў і нацыянальны перыяд. Мяжой паміж вызначанымі перыядамі правамерна было б прызнаць час набыцця

беларускай нацыяй сваёй дзяржаўнасці. Даследчыца лічыць, што данацыянальны перыяд распадаецца на чатыры падперыяды:

– першы (з XI па XIII стагоддзе) адпавядае гістарычнаму існаванню адзінай усходнеславянскай народнасці і ўдзельных старажытнарускіх княстваў. Унутрыгарадскія назвы дадзенага перыяду – гэта перш за ўсё назвы цэркваў, сабораў, манастыроў (эклезіёнімы), а таксама асобныя назвы замкаў (айкадамонімы) – фіксуюцца на старажытнарускай мове;

– другі падперыяд ахоплівае час з XIV стагоддзя да сярэдзіны XVI стагоддзя. Дарэчы, у XIV стагоддзі ўпершыню выкарыстаны тэрмін "Белая Русь" у дачыненні да рускіх земляў. Гістарычна ён супадае з паступовым уключэннем у склад Вялікага Княства Літоўскага спачатку Полацкага княства, затым Віцебскага. Фіксацыя эклезіёнімаў, айкадамонімаў, гарадскіх харонімаў (назваў частак гарадской тэрыторыі), першых гадонімаў (назваў лінейных аб'ектаў) адбываецца на старабеларускай мове;

– трэці падперыяд развіцця беларускай урбананіміі прыпадае на другую палову XVI – першую палову XVIII стагоддзя і адпавядае гістарычнаму існаванню большасці беларускіх гарадоў у складзе Рэчы Паспалітай. Унутрыгарадскія назвы фіксуюцца на польскай мове;

– чацвёрты падперыяд, які доўжыўся з другой паловы XVIII стагоддзя да пачатку XX стагоддзя, звязаны з далучэннем часткі беларускіх земляў да Расіі. Афіцыйная фіксацыя ўрбанонімаў у гэты час адбываецца на рускай мове.

Нацыянальны перыяд развіцця беларускай урбананіміі можна падзяліць на тры нераўназначныя ў дачыненні да часавых межаў падперыяды:

– першы ахоплівае адно дзесяцігоддзе – з 1919 па 1929 год – і звязаны з працэсам беларусізацыі. Унутрыгарадскія назвы ў гэты падперыяд становяцца беларускамоўнымі;

– другі доўжыўся з 30-х гадоў да 1985 года. У гэтыя гады ўрбананімія Беларусі зноў атрымлівае рускамоўную фіксацыю;

– трэці падперыяд распачаты з 1985 года і працягваецца ў нашы дні. Асноўная прыкмета яго – паступовае вяртанне ўнутрыгарадскім назвам Беларусі нацыянальнай формы.

Вывучэннем анамастычных адзінак, такі, як тапонімы, урбанонімы, займаліся навукоўцы XIX–XX стагоддзяў: М. Я. Марошкін, Н. М. Тупікоў, А. М. Селішчаў, В. К. Чычагаў, Н. А. Баскакаў, В. Д. Бандалетаў, Б. А. Успенскі, А. В. Суперанская, У. А. Ніканаў, У. І. Супрун і мн. інш.

Былі вызначаны анамастычныя і тапанімічныя мадэлі (В. А. Ніканаў), вырашалася пытанне пра значэнне ўласных імёнаў (Е. Курыловіч, У. І. Болатаў і інш.), была распрацавана тэорыя імя ўласнага (А. В. Суперанская), выпрацаваны задачы і метады антрапанімікі (В. А. Ніканаў) і г. д. Гаварылася пра ўласнае імя як пра сацыяльны знак (В. А. Ніканаў), пра сувязь імя і грамадства (В. А. Ніканаў, В. Д. Бандалетаў, А. В. Суперанская, В. А. Левашова і інш.).

Кампаненты ўнутрыгарадской тапанімнай прасторы: *агаронімы* – назвы гарадскіх плошчаў, рынкаў; *гадонімы* – назвы лінейных аб’ектаў у горадзе, у тым ліку вуліц, завулкаў, праездаў, гасцінцаў, праспектаў, набярэжных; *гарадскія харонімы* – назвы раёнаў горада; *эклезіёнімы* – уласныя імёны месцаў здзяйснення абрадаў, глыбокай пашаны любой рэлігіі, у тым ліку назвы сабораў, цэркваў, касцёлаў; *эргонімы* – уласныя імёны дзелавых аб’яднанняў людзей, у тым ліку ўстаноў, прадпрыемстваў і пад.) павінны адказваць шэрагу патрабаванняў, сярод якіх можна вылучыць наступныя: актуальнасць, адпаведнасць часу, граматычная правільнасць, зручнасць выкарыстання і матываванасць найменняў.

З улікам гэтых патрабаванняў у рускай і беларускай тапаніміцы выпрацавана адзіная класіфікацыя найменняў геаграфічных аб’ектаў.

Урбананімная прастора шматмерная і разнапланавая. Яе склад і ўласцівасці дыктуюцца традыцыямі культурнага вопыту народа, які стварыў кампаненты гэтай тапанімнай сістэмы. Культурна-гістарычныя, ідэйна-палітычныя і эстэтычныя элементы семантычнай і структурнай арганізацыі ўрбанонімаў выступаюць у якасці

сістэмаўтваральных фактараў фарміравання моўнай урбананімнай сістэмы ў рускай і беларускай традыцыях тапанімных даследаванняў.

У лексічных (у тым ліку тапанімных) адзінках мовы ўтрымліваецца найбагацейшая інфармацыя аб сістэме каштоўнасцей таго ці іншага народа, якая раскрывае асаблівасці бачання свету і якая з'яўляецца своеасаблівым арыенцірам у яго авалоданні.

Каштоўнай крыніцай вывучэння духоўнай культуры народа з'яўляецца ўрбананімная лексіка. Важнасцю тапанімных фактаў і адносін для вырашэння многіх тэарэтычных пытанняў, каштоўнасцю іх для параўнальна-гістарычных, этымалагічных даследаванняў, значнасцю ўрбананімных фактаў для вырашэння культуралагічных праблем тлумачыцца неабходнасць вывучэння ўнутрыгарадскіх назваў.

*Унутрыгарадскія назвы* – урбанонімы – не толькі шматлікія, але і разнастайныя па часе ўзнікнення, моўнай прыналежнасці, значэнні, структуры, гістарычным лёсе. Кожны паасобку і ўсе разам яны сталі неад'емнай часткай жыцця грамадства, неабходнай умовай для нармальнага функцыянавання любога горада – вялікага ці малога.

Вывучаючы гісторыю развіцця ўрбананіміі беларускага краю, нельга не адзначыць павелічэнне колькасці, змены характару найменняў і тыя лексіка-семантычныя пераўтварэнні, якія адбываліся ва ўнутрыгарадскіх назвах з XIV па XX стагоддзе.

Паколькі найбольш значнымі аб'ектамі маладых беларускіх гарадоў былі цэрквы і манастыры, то і першыя зафіксаваныя ўрбанонімы, па дадзеных помнікаў пісьменства, – гэта іх назвы. У XII – першай палове XV стагоддзя звычайна ўласціва ўжыванне назваў без індыкатараў царква, манастыр, храм. У другой палове XV стагоддзя, асабліва ў канцы стагоддзя, звычайнымі становяцца тры мадэлі: у першую чаргу гэта назвы, якія ўключаюць тэрмін-індыкатар і кіруюць формай роднага склону назоўніка з азначэннямі Святы, вялікі, Прачыстая. З'яўляецца

таксама мадэль найменне са словаформай “у імя”. Нярэдкія ў дзелавых дакументах XV стагоддзя назвы цэркваў і манастыроў, пабудаваныя па мадэлі, якая была шырока распаўсюджана, як сведчыць даследаванне М. В. Падольскай, ва ўсходняй Русі – з прыназоўнікава-склонавай формай, што канкрэтызуе месцазнаходжанне аб’екта.

Другую ў значнай меры разгорнутую групу ўнутрыгарадскіх назваў XIV–XV стагоддзяў складаюць найменні зямельных участкаў, двароў. Намінацыя іх у адзначаны перыяд адбывалася галоўным чынам двума шляхамі. Перш за ўсё імем уладальніка. Некаторая частка зямельных участкаў мела назвы апісальнага характару і матывавалася назвамі іншых унутрыгарадскіх аб’ектаў.

Урбананімная лексіка пачынае папаўняцца за кошт з’яўлення назваў вуліц. Адным з першых дакументаў, у якім згадваюцца назвы вуліц, з’яўляецца дакумент 1485 года, які зафіксаваў назвы двух вуліц у Бярэсці (сучасным Брэсце).

Аднак асабліва інтэнсіўнае ўзбагачэнне ўрбананімнай лексікі старабеларускай мовы пачынаецца з сярэдзіны XVI стагоддзя, калі ўзнікла неабходнасць у дакладных зямельных апісаннях абласцей Вялікага Княства Літоўскага. Гэта, у сваю чаргу, з’явілася прычынай, якая выклікала ў сярэдзіне XVI стагоддзя шэраг рэвізій, вопісаў названых абласцей, што ў значнай ступені садзейнічала развіццю ўрбананімічнай тэрміналогіі.

Рынкі, якія з’явіліся ў гарадах, першапачаткова не мелі ўласных назваў. Не ўзнікала і неабходнасці іх называць, паколькі, як правіла, у горадзе было па адным рынку, правы на функцыянаванне якога фіксаваліся каралеўскімі прывілеямі. Аднак з цягам часу ў сувязі з ростам гарадоў у некаторых з іх адкрываўся яшчэ адзін, а часам і два рынкі, адрозніваць якія дапамагалі назвы. У большасці выпадкаў у аснову назвы клалася якасная прыкмета (Высокі рынак – Менск, 1560 год) ці прыкмета па нацыянальнай прыналежнасці тых, хто адкрываў рынак (Нямецкі рынак – Гродна, 1560 год).

Тэрмін “вуліца” ў адзначаны перыяд у сілу сваёй навізны не меў аднолькавай фіксацыі, што сведчыць пра розніцу ў вымаўленні яго на розных тэрыторыях.

Найбольш прадуктыўнымі з семантычных тыпаў беларускіх урбанонімаў да XVI–XVII стагоддзяў застаюцца назвы, матываваныя назвамі населеных пунктаў; якія апісваюць месцазнаходжанне лінейнага аб’екта; матываваныя назвамі бліжэйшага значнага аб’екта.

На працягу XVIII–XIX стагоддзяў значна ўзрастае колькасць гарадоў з зарэгістраванымі ў іх вуліцамі, пры намінацыі якіх выкарыстоўваецца ўласнае імя.

Першыя назвы мемарыяльнага характару ў гонар відных чыноўнікаў і дзяржаўных дзеячаў з’явіліся ў другой палове XIX стагоддзя. Гэта былі, напрыклад, Скобелеўская вуліца ў Мінску і Гомелі, Аляксандраўская вуліца ў Брэсце, праспект Генерала Рыхтэра, праспект Князя Трубяцкога ў Барысаве і інш. Для параўнання трэба адзначыць, што ў нацыянальны перыяд развіцця беларускай урбананіміі доля назваў вуліц, плошчаў, праспектаў, тупікоў, праездаў і г. д., утвораных ад уласных імёнаў, пастаянна ўзрастала, пашыраўся дыяпазон імёнаў асоб, што ўключаліся ва ўрбананімію.

Канцу XIX – пачатку XX стагоддзя ўласціва праява цікавасці да маляўнічых назваў унутрыгарадскіх аб’ектаў. Асабліва гэта тычыцца заходніх гарадоў Беларусі – не без уплыву польскіх урбананімных традыцый: Вясёлая вуліца, вуліца Раскоша і г. д. З’яўляюцца метафарычна асэнсаваныя (завулак Штаны), каляровыя (Чорная вуліца), фларыстычныя (Дубовая вуліца, Ліпавая вуліца, Сасновая вуліца, Лозовая вуліца), фаўністычныя (Казлова вуліца, Валоў вуліца) урбанонімы.

Семантычна пераўтвараюцца і назвы, звязаныя з прафесійнай і саслоўнай дыферэнцыяцыяй жыхароў. Калі ў XVI стагоддзі ўрбанонімы тыпу Кушнерская вуліца і Кажамяцкая вуліца заключалі ў сабе інфармацыю пра рамяство жыхароў дадзенай вуліцы (існаваў звычай, які прадпісваў людзям, занятым аднолькавым рамяством, сяліцца разам), то ў XVIII стагоддзі назвы ўнутрыгарадскіх аб’ектаў гэтага тыпу ўжо не нясуць інфармацыі аб прафесіі гараджан, якія жывуць на іх, а як бы сімвалізуюць пэўныя прафесіі.

Нарэшце, самымі познімі ў данацыянальны перыяд сталі назвы, якія ўключаюць словы з абстрактным значэннем, перш за ўсё найменні месяцаў, што раней да працэсу намінацыі гарадскіх аб'ектаў не прыцягваліся: Красавіцкая вуліца, Ліпеньская вуліца.

Такім чынам, унутрыгарадскія назвы Беларусі – урбанонімы – з'яўляюцца помнікамі культуры беларускага народа не менш значнымі, чым архітэктурныя збудаванні, творы народнай творчасці і літаратуры, кінафотадакументаў, рукапісы і інш.

# МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## Практычныя заняткі 1.
## Тапаніміка як навука і раздзел анамастыкі

***Пытанні***

1. Прадмет і задачы тапанімікі.
2. Раздзелы тапанімікі. Асноўныя разрады тапонімаў.
3. Вывучэнне тапанімікі Беларусі ў XIX – першай палове XX ст.
4. Сучасны стан беларускай тапанімікі.
5. Даследаванне тапанімічнага матэрыялу Брэстчыны.

***Тэмы рэфератаў***

1. Тапанімічная сістэма. Тапанімічныя асновы. Тапанімічныя фарманты.
2. Намінатыўная і характарыстычная функцыі тапонімаў.
3. Назвы, утвораныя ад агульных назоўнікаў – прыродна-геаграфічных тэрмінаў і слоў, звязаных з працоўнай дзейнасцю чалавека.
4. Навуковая і народная этымалогія геаграфічных назваў.
5. Асноўныя погляды на паходжанне назваў Белая Русь, Беларусь.
6. Узаемадзеянне паміж рознымі тапанімічнымі класамі.

## Практычныя заняткі 2.
## Гідраніміка як раздзел тапанімікі. Айканіміка як раздзел тапанімікі

***Пытанні***

1. Асноўныя этапы фарміравання айканіміі.
2. Прынцыпы класіфікацыі айконімаў.
3. Дасягненні ў галіне айканімічнай лексікаграфіі.
4. Спосабы словаўтварэння, якія выкарыстоўваюцца ў айканіміі.

5. Гідронімы – найстаражытнейшы разрад тапонімаў.

6. Асаблівая роля водных аб'ектаў у жыцці чалавека.

7. Гідранімія Беларусі ў навуковых даследаваннях.

***Тэмы рэфератаў***

1. Рэкі і азёры як асноўныя арыенціры ў акаляючым свеце.

2. Асноўныя прынцыпы намінацыі гідранімії і мікрагідранімії басейна ракі Заходні Буг.

3. Лексіка-семантычная характарыстыка гідронімаў Пабужжа.

4. Прадуктыўныя і непрадуктыўныя словаўтваральныя мадэлі айконімаў.

5. Айканімія Брэсцкай вобласці: структурна-семантычны аспект.

6. Лексічныя рэсурсы, якія паслужылі базай для фарміравання назваў паселішчаў Брэстчыны.

7. Дэрыватыўныя сувязі гідронімаў з айконімамі і іншымі разрадамі онімаў.

## Практычныя заняткі 3.
## Мікратапаніміка як раздзел тапанімікі. Урбананіміка і віканіміка як раздзелы тапанімікі

***Пытанні***

1. Мікратапаніміка – навука пра назвы малых геаграфічных аб'ектаў.

2. Мікратапонімы як асаблівы клас тапонімаў. Асноўныя разрады мікратапонімаў.

3. Рэгіянальны аспект вывучэння мікратапанімії.

4. Лінгвакультуралагічны падыход пры даследаванні мікратапанімії.

5. Асноўныя перыяды і працэсы ў гісторыі беларускай урбананімікі.

6. Прынцыпы намінацыі і структурныя асаблівасці ўнутрысельскіх аб'ектаў.

***Тэмы рэфератаў***

1. Мікратапонімы, утвораныя ад іншых разрадаў уласных імёнаў.
2. Мікратапонімы як словаўтваральная база для айконімаў.
3. Мікратапанімія Брэстчыны ў лінгвакультуралагічным аспекце.
4. Аб'ём і змест урбанонімнай прасторы.
5. Прынцыпы і прыкметы намінацыі ўнутрыгарадскіх аб'ектаў.
6. Урбанонімы і віконімы: агульнае і адрознае.

## ТЭСТ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

Тэст для самакантролю

# СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Прадмет і задачы тапанімікі.
2. Метады і прыёмы даследавання тапанімічнага матэрыялу: дэскрыптыўны (апісальны) метад, параўнальна-гістарычны метад, параўнальна-тыпалагічны, арэальны метад.
3. Метады і прыёмы даследавання тапанімічнага матэрыялу: тэксталагічны аналіз, стратыграфічны аналіз, этымалагічны аналіз, структурна-граматычны аналіз.
4. Тапаніміка як навука і раздзел анамастыкі.
5. Раздзелы тапанімікі. Асноўныя разрады тапонімаў.
6. Вывучэнне тапанімікі Беларусі ў XIX – першай палове XX ст.
7. Сучасны стан беларускай тапанімікі.
8. Даследаванне тапанімічнага матэрыялу Брэстчыны.
9. Лексіка-семантычныя групы назваў паселішчаў.
10. Асноўныя этапы фарміравання айканіміі.
11. Лексікаграфічныя даведнікі па айканіміі Беларусі.
12. Гідраніміка як раздзел тапанімікі.
13. Гідранімія і мікрагідранімія Брэсцкай вобласці ў навуковых даследаваннях.
14. Мікратапаніміка – навука пра назвы малых геаграфічных аб'ектаў.
15. Рэгіянальны аспект вывучэння мікратапаніміі.
16. Лінгвакультуралагічны падыход пры даследаванні мікратапаніміі.
17. Урбананіміка.
18. Асноўныя перыяды і працэсы ў гісторыі беларускай урбананімікі.
19. Прынцыпы намінацыі і структурныя асаблівасці ўнутрысельскіх аб'ектаў.
20. Узаемадзеянне паміж рознымі тапанімічнымі класамі.

# ПЫТАННІ ДЛЯ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## *Асноўная*

1. Адамовіч, Я. М. Мікратапанімічныя назвы / Я. М. Адамовіч. – Мінск : Выш. шк., 1971. – 107 с.

2. Багамольнікава, Н. А. Гідронімы басейна ракі Прыпяць: структурна-семантычныя тыпы матывацыі / Н. А. Багамольнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2004. – 195 с.

3. Багамольнікава, Н. А. Тапанімія Гомельшчыны: структурна-семантычная характарыстыка : манаграфія / Н. А. Багамольнікава ; навук. рэд. А. А. Станкевіч ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. – 242 с.

4. Богоедова, Т. Н. Гидронимия бассейна Сожа (праславянский фонд) : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.03 / Т. Н. Богоедова. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 1997. – 141 л.

5. Беларуская анамастыка : зб. арт. / рэд. М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 200 с.

6. Беларуская анамастыка : зб. арт. / рэд. В. П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 211 с.

7. Беларуская анамастыка : зб. арт. / рэд. В. П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 173 с.

8. Беларуская антрапанімія : вучэб. дапам. / Г. М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", 2009. – 254 с.

9. Белорусская ономастика. Топонимия : учеб. пособие / А. М. Мезенко [ и др.] ; под общ. ред. А. М. Мезенко. – Минск : Элайда, 2012. – 243 с.

10. Бирилло, Э. К. Ойконимия Гомельской области : автофер. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Э. К. Бирилло. – Минск : МГПИ им. А. М. Горького, 1974. – 24 с.

11. Бірыла, М. В. Літоўскія элементы ў беларускай анамастыцы / М. В. Бірыла, А. А. Ванагас. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 100 с.

12. Бірыла, М. В. Аб узаемадзеянні антрапанімічных асноў / М. В. Бірыла // Пытанні беларускай тапанімікі : матэрыялы Першай беларус. тапанім. канф. – Мінск : Выш. шк., 1970. – С. 49–56.

13. Бірыла, М. В. Анамастычныя словаўтваральныя элементы ва ўсходне- і заходнеславянскіх мовах (Адантрапанімічныя айконімы) / М. В. Бірыла, В. П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 63 с.

14. Гуліцкая, В. А. Семантычная матывацыя ўрбонімаў Гомеля / В. А. Гуліцкая, Н. А. Старасценка // Беларуская мова : міжведамас. зб. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – Вып. 17. – С. 38–43.

15. Емельянович, В. М. Микротопонимия северо-западной части Брестской области : автореф. дис. . . . канд. филол. наук : 10.02.02 / В. М. Емельянович. – Минск, 1982. – 26 с.

16. Емельяновіч, В. М. Землеробчая лексіка як аснова мікратапаніміі паўночна-заходняй часткі Брэсцкай вобласці / В. М. Емельяновіч // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1984. – № 2. – С. 68–75.

17. Емельянович, В. М. Особенности микротопонимии Брестчины / В. М. Емельянович // Региональные особенности восточнославянских языков, литературы, фольклора и методы их изучения. – Гомель, 1985. – С. 66–68.

18. Емельяновіч, В. З гісторыі назваў Берасцейшчыны: Брэст, Драгічын, Жабінка, Камянец, Кобрын, Пружаны / В. М. Емельяновіч // Роднае слова. – 1993. – № 9. – С. 24–25.

19. Емельяновіч, В. М. З гісторыі некаторых назваў / В. М. Емельяновіч // Берасцейскія карані : гіст.-краязн. і літ. зб. – Брэст, 1993. – С. 108–111.

20. Емельяновіч, В. М. Беларуская анамастыка ў школе : ***матэрыялы спецкурса*** і спецсемінара / В. М. Емельяновіч. – Брэст, 1999. – 50 с.

21. Жучкевич, В. А. Происхождение географических названий (топонимика) Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1961. – 79 с.

22. Жучкевич, В. А. Топонимика Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Наука и техника, 1968. – 184 с.

23. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1974. – 447 с.

24. Жучкевич, В. А. Улицы помнят: История, события, люди в названиях улиц и площадей города-героя Минска / В. А. Жучкевич. – Минск : Наука и техника, 1979. – 185 с.

25. Жучкевич, В. А. Общая тапонимика / В. А. Жучкевич. – Минск : Выш. шк., 1980. – 287 с.

26. Іванова, Г. А. Мікратапонімы-назоўнікі Мазырскага Палесся ў форме множнага ліку / Г. А. Іванова // Беларуская анамастыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – С. 131–138.

27. Казлова, Р. М. Айканімія Беларускага Палесся. Генезіс назваў : манаграфія / Р. М. Казлова ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 320 с.

28. Катонова, Е. М. Гидронимия Западной Двины на территории Белоруссии : автореф. дис. ... канд. филол. наук / Е. М. Катонова. – Минск, 1975. – 24 с.

29. Лемтюгова, В. П. Восточнославянская айконимия аппелятивного происхождения (названия типов поселений) / В. П. Лемтюгова. – Минск : Наука и техника, 1983. – 198 с.

30. Лемцюгова, В. П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 156 с.

31. Лемцюгова, В. П. Беларуская анамастыка. Дасягненні і перспектывы / В. П. Лемцюгова // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы II Междунар. науч. конф. “Славянская ономастика в ареальном, этимологическом

и хронологическом аспектах" / отв. ред. Р. М. Козлова. – Гомель : УО "ГГУ им. Ф. Скорины", 2004. – С. 107–112.

32. Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць : навук.-папуляр. эцюды / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Літ. і мастацтва, 2008. – 196 с.

33. Лыч, Л. М. Назвы зямлі беларускай / Л. М. Лыч. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 128 с.

34. Мезенка, Г. М. Беларуская анамастыка / Г. М. Мезенка. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 119 с.

35. Мезенка, Г. М. Гісторыя беларускай зямлі ва ўласных імёнах: па слядах Дзён пісьменства : манаграфія / Г. М. Мезенка, І. Л. Капылоў. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2015. – 140 с.

36. Мезенко, А. М. Белорусская ономастика. Топонимия : учеб. пособие / А. М. Мезенко. – Минск : Элайда, 2012. – 260 с.

37. Мезенко, А. М. Имя внутригородского объекта в истории: Об урбанонимах Беларуси XIV – нач. XX в. / А. М. Мезенко. – Минск : Выш. шк., 2003. – 301 с.

38. Мікратапанімія Брэстчыны : слоўнік / скл.: Л. В. Леванцэвіч, Н. Р. Якубук, Т. А. Кісель. – Брэст : БрДУ, 2022. – 296 с.

39. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобласць : нармат. давед. / І. А. Гапоненка [і інш.] ; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2010. – 319 с.

40. Подольская, Н. В. Типовые восточнославянские топоосновы. Словообразовательный анализ / Н. В. Подольская. – М. : Наука, 1983. – 158 с.

41. Рогалеў, А. Ф. Сцежкі ў даўніну: Геаграфічныя назвы Беларускага Палесся / А. Ф. Рогалеў. – Мінск : Полымя, 1992. – 159 с.

42. Рогалев, А. Ф. Этнотопонимия Беларуси (на фоне этнической истории) / А. Ф. Рогалев. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 1993. – 168 с.

43. Рогалев, А. Ф. От Гомеюка до Гомеля. Городская старина в фактах, именах, лицах / А. Ф. Рогалев. – Изд. 2-е, перераб. и доп. – Гомель : Барк, 2006. – 220 с.

44. Рогалев, А. Ф. Географические названия в калейдоскопе времён / А. Ф. Рогалев. – Гомель : Барк, 2008. – 256 с.

45. Смаль, Н. Р. Гідранімія і айканімія Пабужжа. Праблема ўзаемадзеяння : аўтарэф. дыс. . . . канд. філал. навук. / Н. Р. Смаль. – Мінск, 1996. – 17 с.

46. Суперанская, А. В. Что такое топонимика? / А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1975. – 176 с.

47. Топоров, В. Н. Лингвистический анализ гидронимов Верхнего Поднепрвья / В. Н. Топоров, О. Н. Трубачёв. – М. : Изд-во АН СССР, 1962. – 270 с.

48. Шклярык, В. А. Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы / В. А. Шклярык ; навук. рэд. І. Л. Капылоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2019. – 195 с.

49. Шур, В. В. З гісторыі ўласных імёнаў / В. В. Шур ; пад рэд. П. У. Сцяцко. – Мінск : Выш. шк., 1993. – 156 с.

50. Шур, В. В. Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапаніміка і тапаніміка : дапам. для настаўнікаў / В. В. Шур. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 239 с.

51. Якубук, Н. Р. Гідранімія басейна Заходняга Буга / Н. Р. Якубук // Вес. АН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1995. – № 2. – С. 116–121.

52. Якубук, Н. Р. Гідранімія Беларусі (гістарыяграфія праблемы) / Н. Р. Якубук // Канцэптуальныя падыходы да рэалізацыі зместу філалагічнай адукацыі ў школе і вну: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Рэсп. навук. канф., 21–22 кастр. 2004 г.– Брэст : Академия, 2005. – С. 281–284.

53. Якубук, Н. Р. Айканімія Лунінеччыны / Н. Р. Якубук // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філал. навук. Літаратуразнаўства. Мовазнаўства. – 2006. – № 2 (5). – С. 108–112.

54. Якубук, Н. Р. Адметныя рысы мікратапанімії Іванаўшчыны / Н. Р. Якубук // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы IV Междунар. науч.-метод. конф., Брест, 25–26 нояб. 2009 г. : в 2 ч. – Брест : БрГУ, 2010. – Ч. 2. – С. 197–202.

55. Якубук, Н. Р. Адапелятыўныя айконімы Пабужжа (матэрыялы да слоўніка) / Н. Р. Якубук // Беларуская дыялекталогія. Матэрыялы і даследаванні : зб. навук. арт. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – Вып. 3. – С. 137–140.

56. Якубук, Н. Р. Семантычныя адметнасці мікратапаніміі Брэстчыны / Н. Р. Якубук // Моўная адзінка ў кантэксце часу : зб. матэрыялаў II Рэсп. навук.-практ. канф., Брэст, 18 лістап. 2016 г. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: Л. В. Леванцэвіч [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2016. – С. 216–221.

57. Яшкін, І. Я. Беларускія геаграфічныя назвы. Тапаграфія. Гідралогія / І. Я. Яшкін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 256 с.

### *Дадатковая*

58. Адамовіч, Я. М. Пра сувязь тапаніміі і мікратапаніміі / Я. М. Адамовіч // Філалогія : матэрыялы навук. канф. – Мінск, 1973. – С. 3.

59. Акаловіч, Л. А. Пра паходжанне некаторых тапонімаў Гродзеншчыны / Л. А. Акаловіч // Пытанні беларускай тапанімікі : матэрыялы Першай беларус. тапанім. канф. – Мінск : Выш. шк., 1970. – С. 176–180.

60. Алексіюк, М. Пра тапаніміку Брэстчыны / М. Алексіюк // Полымя. – 1986. – № 2. – С. 239.

61. Аліферчык, Т. М. Этнонімы ляхі і мазуры ў заходнепалескай тапаніміі / Т. М. Аліферчык // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філал. навук. – 2009. – № 2. – С. 117–121.

62. Бірыла, М. В. Тапонімы Гомельшчыны з суфіксамі -айка/-еўка/ -ёўка / М. В. Бірыла // Пытанні беларускай тапанімікі : матэрыялы Першай беларус. тапанім. канф. – Мінск : Выш. шк., 1970. – С. 98–108.

63. Васілюк, Н. І. Лексіка-семантычныя тыпы мікратапаніміі паўднёва-заходняй часкі Брэстчыны / Н. І. Васілюк // Беларуская анамастыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – С. 103–114.

64. Василюк, Н. И. Названия балот в говорах Брестчины / Н. И. Василюк // Региональные особенности восточнославянских языков, литературы, фольклора и методы их изучения. – Гомель, 1985. – С. 26–28.

65. Выгонная, Л. Т. К системному описанию полесских названий земельных угодий / Л. Т. Выгонная // Полесье (Лингвистика. Археология. Топонимика) : сб. ст. – М. : Наука, 1968. – С. 118–125.

66. Дарошка, М. А. Мясцовыя геаграфічныя апелятывы ў мікратапаніміі Тураўскага Палесся / М. А. Дарошка // Беларуская анамастыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – С. 69–95.

67. Емельяновіч, В. М. Азнаямленне студэнтаў з працэсам узаемапранікнення тапонімаў і мікратапонімаў на беларуска-польскім памежжы / В. М. Емельяновіч // Беларуска-польскае ўзаемадзеянне ў галіне культуры : матэрыялы навук.-практ. канф. / рэд. В. Я. Ляшук [і інш.]. – Брэст : БДПІ, 1993. – С. 60–65.

68. Емельяновіч, В. М. Геаграфічная тэрміналогія як крыніца мікратапаніміі (на матэрыяле Пружанскага і Камянецкага раёнаў Брэсцкай вобласці) / В. М. Емельяновіч // Беларуская анамастыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – С. 87–98.

69. Емельяновіч, В. М. Назвы флексійнага, суфіксальна-флексійнага ўтварэння ў тапаніміі Берасцейшчыны / В. М. Емельяновіч // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы междунар. науч. конф., Гомель, 21–22 нояб. metricconverterProductID2002 г2002 г. – Гомель : УО «ГГУ им. Ф. Скорины», 2002. – С. 75–79.

70. Еўтухаў, І. Д. Назвы забалочаных мясцін Гомельшчыны / І. Д. Еўтухаў // Рэгіянальныя асаблівасці ўсходнеславянскіх моў. – Гомель, 1990. – С. 43–45.

71. Кузьменка, Г. У. Лексіка-семантычныя асаблівасці айконімаў-кампазітаў Гомельшчыны / Г. У. Кузьменка // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы III Междунар. науч. конф. “Славянская ономастика в ареальном, этимологическом аспектах”, 6–7 окт. 2006 г. / отв. ред. Р. М. Козлова. – Гомель :

ГГУ им. Ф. Скорины, 2006. – С. 129–137.
72 . Леванцэвіч, Л. В. Палеская язычніцкая (культавая) мікратапаніміка / Л. В. Леванцэвіч // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы Междунар. науч. конф. / отв. ред. Р. М. Козлова. – Гомель : УО "Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины", 2002. – С. 141–145.
73. Лемцюгова, В. П. Аб адной разнавіднасці апелятыўных тапаасноў (на матэрыяле тапанімii Брэстчыны) / В. П. Лемцюгова // Беларуская анамастыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – С. 38–52.
74. Миканов, В. А. Введение в топонимику / В. А. Миканов. – М. : Наука, 1965. – 179 с.
75. Рогалеў, А. Ф. Назвы Бацькаўшчыны: (тапанімія Беларусі) / А. Ф. Рогалеў. – Гомель : Барк, 2008. – 216 с.
76. Толстой, Н. И. О лингвистическом изучении Полесья / Н. И. Толстой // Полесье (Лингвистика. Археология. Топонимика). – М. : Наука, 1968. – С. 5–17.
77. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский ; предисл., текстол. подгот., прим. и коммент. С. А. Кузняевой. – Минск : Беларусь, 2004. – 251 с.
78. Якубук, Н. Р. Айканімія Жабінкаўшчыны / Н. Р. Якубук, В. Андрасюк // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы II Междунар. науч. конф. «Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах», 11–12 нояб. 2004 г. / отв. ред. Р. М. Козлова. – Гомель : УО "ГГУ им. Ф. Скорины", 2004. – С. 272–276.

# СОДЕРЖАНИЕ


ПРАДМОВА . . . 4
ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ . . . 7

**ТЭАРЭТЫЧНЫ КУРС** **10**
**Тапаніміка як навука і раздзел анамастыкі** . . . 10
З гісторыі вывучэння беларускай тапанімікі . . . 12
Даследаванне анамастыкону Брэстчыны . . . 20
**Дасягненні ў вывучэнні беларускай айканіміі** . . . 25
**Гідраніміка як раздзел тапанімікі** . . . 30
**Мікратапаніміка як раздзел тапанімікі** . . . 35
Вывучэнне мікратапаніміі ў рэгіянальным аспекце . . . 37
Лінгвакультуралагічны падыход пры даследаванні мікратапаніміі . 39
**Урбананіміка як раздзел тапанімікі** . . . 43

**МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ** **50**
Практычныя заняткі 1. Тапаніміка як навука і раздзел анамастыкі . 50
Практычныя заняткі 2. Гідраніміка як раздзел тапанімікі. Айканіміка як раздзел тапанімікі . . . 50
Практычныя заняткі 3. Мікратапаніміка як раздзел тапанімікі. Урбананіміка і віканіміка як раздзелы тапанімікі . . . 51
**ТЭСТ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ** . . . 52
**СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ** . . . 53
**ПЫТАННІ ДЛЯ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ** . . . 54

ТЭСТ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ 39
ПЫТАННІ ДЛЯ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ 41
СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ 42